*Но это было уже начало 1921 года. Зима, кормов мало. И в одно время приехал мамы шурин, Альбин, муж маминой сестры Влади, с таким советом: один человек имел много земли, но не имел лошади и за одну лошадь давал четыре гектара земли. Чтобы мама за молодую клячу купляла эту землю. Мама опять за советом к Павлу. Тот подумал и говорит: "Дело очень заманчивое, выгодная купля. Но Россия ещё воюет, кто знает, может, опять ударит по Польше, тогда нет надобности землю куплять. Но поедем, поговорим". Когда начали говорить по делу, то оказалось, что там был хитрый кулак. Лошадь брал, землю давал, но документы делать у нотариуса не хотел, а советовал сделать какое-то духовное завещание только через ксендза. Имел силу только после смерти продавца. Тогда Павел маме так и расшифровал: "Кулак хитрый, клячу возьмёт, даст кусок неудобия. Если большевики придут, то ему всё равно земля пропала, а лошадь его. А если Польша будет, то те документы не имеют никакой силы. И в любое время он или его дети тебя судом выгонят. И всё". На этом и порешили. А кормить двоих коней нет чем. И молодую клячу мама продала. А деньги в то время почему-то дешевели с каждым днём. Скажем, если в этот базар лошадь была сто тысяч марок польских, то в следующий она уже стоила 500 (тысяч) марок. Таким путём мама продала ещё в то время, когда деньги были дороже, но сразу за них ничего не купила. А через некоторое время они совсем пали. Дошло до того, что я уже помню, как курица стоила три миллиона марок. Таким путём мама за клячу купила только поросёнка. И то, ума хватило. А вскоре стала реформа, и Польша установила злотый. Тогда деньги стали нормальные.*

На тэрыторыі Польшчы да заканчэньня Першай сусьветнай вайны ў звароце знаходзілася некалькі розных грашовых адзінак. Акрамя аўстра-вугорскай кроны, нямецкай маркі і расейскага рубля, якія цыркулявалі ў адпаведных частках Польшчы, у звароце таксама знаходзіліся эмітаваныя нямецкімі акупацыйнымі ўладамі падчас Першай сусьветнай вайны острубль і остмарка. У 1917 годзе ўрад Польшчы вырашыў замяніць іх на адзіную грашовую адзінку – польскую марку, па аналогіі з нямецкай маркай.

Уладу ў Польшчы ўзяў аўтарытарны лідар Юзэф Пілсудскі, які кіраваў дзяржавай аж да прыняцьця канстытуцыі. Ён уступіў у канфлікт з РСФСР за валоданьне тэрыторыямі Украіны, Беларусі і Літвы. Канфлікт перарос у савецка-польскую вайну. Вайсковыя выдаткі рэзка вырасьлі. Урадавыя меры збалансаваць бюджэт былі непапулярнымі. У сувязі з гэтым урад падняў падаткі нязначна. У параўнаньні з такімі дзеяньнямі польскага ўрада вельмі цікава выглядае харчразьвёрстка, якую па загадзе бальшавікоў актыўна праводзіла Чырвоная Армія. Можна меркаваць, што адзін толькі гэты факт ужо яскрава тлумачыць тую прычыну, чаму мясцовае насельніцтва масава бегла ад Чырвонай Арміі, але не ад палякаў.

У 1919 годзе ўсе спробы міністра фінансаў ажыцьцявіць стабілізацыю польскай маркі былі дарэмныя, і сабраныя ім сродкі ўвесну 1920 года пайшлі на вайну з РСФСР. У кастрычніку 1920 г. было заключана перамір’е з савецкай Расеяй. У 1921 годзе міністр фінансаў Міхальскі стварыў свой план зьніжэньня выдаткаў і павелічэньня падаткаў у дзяржаўны бюджэт. Але эфект ад яго быў дасягнуты толькі на кароткі час. Затым эканоміка зноў выйшла з-пад кантролю ўрада, і да пачатку лета 1923 гады адбылося значнае падзеньне курсу польскай маркі. Інфляцыя дасягнула свайго піку ў 1923 годзе. Урад Грабскага пратрымаўся ва ўладзе прыкладна два гады, і адным з яго дасягненьняў стала грашовая рэформа, у выніку якой у 1924 годзе марка была заменена злотым (1 злоты = 1,8 млн польскіх марак).

*Оставшись, мама с одной лошадью и двумя коровами, договорилась с Сивицкими вместе занимать запашку. Вместе обрабатывать, а потом, как с Шишками, делить половину ещё между собой наполовину. Вот этот Роман и занял, да целую*

*волоку, 20 гектаров, возле Лучая. Деревня Васевичи. Весь этот период я уже хорошо помню. Конечно, в детском понятии. В основном я занялся воспоминанием событий всей семьи. А ведь были у меня и свои личные события, детские, которые тоже заняли место в моей памяти.*

*Как я сказал, Шишки поженились и каждый завёл свою жизнь и деятельность. В этот самый период Шишка Эразим, вернувшись с Америки, занялся делать посуду из глины, всевозможного домашнего обихода: миски, тарелки, кружки, кувшины. Он по этому делу был специалист ещё до выезда в Америку. Делал он это всё на специальном кругу, который вращал ногами. Дело очень сложное и интересное. И я просиживал целыми часами и смотрел. К тому же его жена, Казя, очень в то время меня ласкала как сироту. И вот однажды дядя сделал красивую сахарницу и поставил сушить. На крышке были сделаны ангелы с крылышками. Как-то все разошлись, и мне захотелось потрогать. Они были совсем мягкими. Когда я их потрогал, я им посворачивал головки, крылья. А потом и вообще мне понравилось тискать в руках мягкую глину. Я их и совсем сорвал и ушёл, унося с собою в руках только кусок глины. Пришёл домой, как вдруг прибежала тётка Казя и говорит: "Что ты сделал, ты испортил такую вещь". Я испугался, заплакал и сиганул позадворком в кусты. Так что меня разыскивали всей семьёй. А я хотя и видел, что меня ищут, но я понимал, что меня ищут только для того, чтобы высечь ремнём, и я подальше забивался в кусты. Впоследствии всё-таки меня нашли и привели домой. Обошлось без ремня, но зато надолго мне закрылась дверь ходить к дяде. Хотя они меня, может, и не выгоняли б, я сам боялся и не ходил. Это было, наверное, весной 21 года.*

*В это же время было и другое событие для меня. Появился какой-то старик, его откуда-то привезли делать колёса для телег. Ясно, что за войну все остались без повозок, и этот*

*старик остановился у Шишек и делал колёса. Дело было зимой. И я тоже просиживал там целыми днями, ибо было много стружек и было разных обрезков интересных, и я имел с чем заняться. Особенно было интересно, когда дед Ивановский, так его называли, точил на токарном станке ступицы для колёс. Хотя я тогда ничего не соображал, но было занятно смотреть, как вращалось большое колесо, гбалась (гнулася) и кивалась какая-то берёзовая палка. Крутился большой кусок дерева и сыпались мелкие стружки, а я старался подлезть, кабы они сыпались на меня. За что этот дед с седой бородой не раз меня выгонял каким-то жгутом. А когда начала наступать весна, этот дед Ивановский сделал для меня сюрприз – отпилил два кружка с колоды и получились два колеса, потом сделал оську и в оську вправил палку, и положил на печку сушить. Но мне подсказали, что эта колымага для меня. Радости моей не было границ. А всего мучительнее было ожидать, когда она высохнет. И это он сделал для меня как для сироты. И пришёл мой долгожданный день – дед Ивановский вручил мне колымагу. Был, наверное, уже апрель, ибо я бегал по улице. Хотя местами были лужицы, но было тепло, светило солнце, и я босиком бегал. Всё это было почти в одно время с теми злополучными ангелочками. Это была весна 21 года, накануне нашего переезда в деревню Васевичи.*

Для арыентацыі ў часе: менавіта ў гэту вясну, 18 сакавіка 1921 г., паміж Польшчай і РСФСР была падпісана Рыжская дамова, паводле якой усходняя Беларусь заставалася пад савецкай акупацыяй і ператварылася ў марыянеткавую дзяржаву з назвай БССР, а заходняя, у тым ліку і Пастаўшчына, – пад польскай.

*Переезд в Васевичи тоже запамятовался. Первое, что было погружено, – несколько возов. Может, два, может, три воза были высоко нагружены домашним скарбом, обстановкой, всем, что было наше. Главное, что наверху лежал коловрот, на котором мама пряла нитки. Меня посадили наверх и приказали держаться, даже привязали. А мне хотелось крутить это ко-*

*лесо, за что Роман Сивицкий мне угрожал кнутом. Адверд, Эрусь и Антя гнали скот: коров, овечек и свинью.*

Адверд – гэта яшчэ адна мясцовая форма імя Эдвард. І. Сівіцкі пісаў гэта імя або з літарай "д" на канцы, або з літарай "т".

*Ехать надо было через Воропаево, что немало мне оставило впечатления. Первое – что ехали через лес. Этот лес около деревни Мышки. Я впервые в жизни видел большой лес, растущий по больших погурках. А когда подъезжали к Воропаеву, недалеко от дороги было озеро. Это озеро длинное да узкое. А по ту сторону – большой лес. И моим воображением казалось, что лес висел над водой, и мне это врезалось в память. Потом, въезжая в Воропаево, водяная мельница. Мост был или побит снарядами, или взорван. Факт только, что по нему не ездили. А мост этот был с заставами для запора воды, кабы воду пускать на мельничное колесо. Но поскольку мост был неисправный, то и мельница не работала, и став был обмелевший. Люди на лошадях переезжали вброд, а пешеходы переходили через мост, там были положены кладки с досок. Но внизу под этими кладками вода переливалась и страшно шумела. Как начали ехать вброд, я увидел, как первая повозка погрузилась в воду с колёсами. Я начал орать во всю мочь: "Не поеду!" Тогда мама взяла меня на руки и понесла через мост. Но мне и здесь ничего лучшего не оказалось. Доски были высоко над водой, а внизу кипела вода, и страху мне было всё равно не меньше. Да и мать сама тоже боялась. К счастью, шёл случайный человек. Он помог маме со мной перейти. Когда мы оказались на другой стороне, возы уже были переехавши.*

*Начали перегонять скот. Река эта не шире десяти метров, и я всё отлично видел. Коровы пошли, а овцы и свиньи ни в какую не шли. А я опять орал, что утонут. Проехавши это, через некоторое расстояние мне перед моим взором оказался большущий белый дом. Вряд ли я тогда соображал, что это дом. Просто что-то большое, белое, с какими-то причудли-*

*выми возвышениями. Словом, я ничего и не разобрал. А спрашивать было не до допросов. Я сидел, держался за мамин коловрот и больше ничего. После я пробовал спрашивать, что это что-то белое. Мне пояснили, что это – графский дворец. А вот как я спросил, как лес над озером висел, то с меня только смеялись, и никто толком не объяснил.*

*И всё это я только много позже сам расшифровал, когда я батрачил возле Воропаево. Когда мне приходилось проходить по этой дороге. А по этой дороге я ходил домой к маме, сюда в Гулидово. Только тогда я простаивал на этих местах и вспоминал. Мне было уже 16 год жизни. Тогда я разобрался в причудливом белом здании. Это был прекрасной конструкции графский дворец. Стоял, где теперь парк культуры и отдыха всех людей. Это был графский парк и в нём графский дворец. Стоял он там, где теперь памятник героям Великой Отечественной войны. Этого дворца теперь нет, его взорвали немцы в 1944 году при отступлении.*

Гэта быў колішні палац графаў Пшазьдзецкіх. І. Сівіцкі кажа аб тым, што немцы пры адступленьні ўзарвалі яго. Можа, яно так і было, але нават у такім выпадку канчаткова гэты палац быў зьнішчаны ўжо пасьля вайны, калі яго ўзарваў (атрымліваецца, ужо другі раз пасьля немцаў) вядомы на Пастаўшчыне герой СССР Р.З. Крукаў. Той самы, які яшчэ падчас вайны адзначыўся сваім “геройствам”, справакаваўшы немцаў на поўнае зьнішчэньне в. Альцы (пра што больш падрабязна напісана ў кніжцы “Нашы карані” Вальдамары Шышко).

*А где был брод, там был большой став, а мост был справный. А висячий лес, он был по ту сторону озера. И про этот лес ниже расскажу ещё два события, но я был уже взрослый.*

*Итак, начали жить в Васевичах. Прожили там один год, и этот год был также тяжёлым. Жили в одном доме с хозяевами. Хозяева были старые. Люди оказались грубые. Кроме того, рядом жили их два сына, семейные, и жили отдельно, но всегда везде совали свой нос в наши дела. Мамины сотрудники,*

*Вацлав и Роман, были молодые и неопытные в хозяйстве. А эти Рагини, их такая фамилия – Регино, эти сыновья хозяина были зверски плохие. Дом большой, имел расположение вроде нашего. Печь одна, а готовили три семьи, ибо эти Вацлав и Роман отдельно себе готовили. Работы было пропасть. Адверт и Антя тоже работники слабые. Да и недоедание было, жили впроголодь. Оказалось, что одним конём этого участка не обработать. Мама решила продать одну корову и купить второго коня, что было и сделано. А покупал этого коня один Роман, и ему спекулянты всадили больную клячу, и та кляча через месяц и сдохла. Таким путём мама осталась и с одной коровой. Когда дождались нового урожая, жить стало легче. Обмолот производили вручную, цепами.*

*Эти Сивицкие начали при обмолоте красть зерно неделеное, отчего начались ссоры, ругань. Кроме того, оба любили выпить, на это и крали зерно. Курили, и на табак не всегда были деньги. А хозяин имел самосад на чердаке. На чердаке они его и оскубывали втихомолку. Помню, один раз хозяин несёт пук бодыльев табачных и говорит: "Зайцы на чердаке весь лист с табака объели". Я тут и пристал к нему: "Дедушка, покажи зайцев". И после этого всё просил маму, кабы она мне помогла залезть на чердак и поймать зайца.*

*К поздней осени я подрос и настолько осмелел, что начал один ходить во двор вечером по своим надобностям. И здесь не обошлось без приключения. Однажды было поздно вечером, темно, а я пошёл и сел под сараем по своей надобности. А у меня над головой оказалось окошко. Корова была отелившись и ревела по телёнку. Ну, пока я бежал, корова молчала, а потом, вложивши морду в окошко, как рёвнула. И я с перепугу как рёвнул, не хуже коровы, и бросился к крыльцу, и упал в обморок. В доме услышали мой крик, выбежали, но меня взяли в бесчувствии. А к Рождеству мама убила большую свинью. Ту, что за клячу была куплена поросёнком. Приехал дядя Павел и тот по-*

*могал. Сколько было радости мне, когда мне надули свиной пузырь и он получился как теперешний шар. Забросили несколько горошин, он бразжел, вот радость была.*

*В таких условиях наступил 1922 год. Обмолот закончился, закончилась и делёжка зерна. Мама отказалась от такого рода ведения хозяйства. Сивицкие уехали к каким-то своим родственникам. Мы остались жить только своей семьей, и начался новый этап жизни. К этому времени дядя Эрусь Шишка, который делал поливу, купил в Гулидове землю, 22 гек. Этот хутор, где жил Ванюша-"пендзель". А сам тоже был выехавши с Ясневич в Демеши к шурину, то есть к сестре с мужем, Владе и Альбину. Денег у него больше не было, и он тоже искал выход из положения. И нашёл выход вместе с мамой.*

*Первое, что было у нас, – осталась только одна корова и один наш белый конь. А кормов было много. А Шишка купил себе корову, да кормить нет чем. Васевичи и Демеши, эти две деревни были поле с полем, словом, как Гулидово с Лапишками. У них уже была маленькая дочь, и им нужно было молоко. А согласно договорённости мама не имела права своих кормов продавать. Надо было скормить на месте, кабы хозяину остались органические удобрения. Таким образом, пришлось дяде Эрусю свою корову привести к нам. Корова доилась, и Адверд или Антя носили в Демеши молоко. Но и себе мама иногда оставляла ради меня, поскольку я был меньший. Тогда у дяди возник следующий план. На чём они с мамой и порешили. Дяде нужен конь и инвентарь, маме нужен приют с детьми. Значит, дядя забирает нас в Гулидово и мы здесь будем жить. К земле его мы никакого отношения не имеем. Жить будем, как мама сама сообразит. Только что будем жить в его хате бесплатно, а он будет пользоваться нашим конём. Но и выпас будет нашей корове. Была ещё и овечка. А по сути дела хаты в Гулидове ещё не было. Была только землянка, довольно просторная. И в этой землянке жил Нарцизы, меньший брат.*

Нарцызы – гэта яшчэ адна, мясцовая форма імя Нарцыс.

*Хата была куплена. Дядя всю зиму брал нашего коня, перевозил, а Нарцизы охранял. В таких условиях мы ждали весну. Когда мама нам это рассказала, мы были довольны, особенно я. Мне либо только далеко ехать. Помню, как-то приехал дядя Павел, отцов брат. Они долго что-то говорили, мама плакала. В чём было дело, я тогда не разбирался. Только помню, часто вспоминали слово "кутом сести". А по сути дела это была полная мамина капитуляция. Мама больше никак не могла держать хозяйство и его складывала, а сама "садилась кутом". Это в то время в сельской местности любой проживальщик, любой квартирант назывался "кутник". От того, что он в чьём-то доме занимал только один куток, то есть угол. И больше никаких прав. И это очень огорчало маму. Ведь жить-то надо, а на какие средства? Гулидово было ей незнакомо. И не знала, какая здесь будет ожидать её обстановка. Кроме того, "кутник" – это в то время было слово презрения, ибо этот человек ничего не имел. И нигде никакого голоса не имел. Вот это главным образом и печалило маму.*

*Так дожили до весны 1922 года. Где-то в конце марта приехал дядя на Альбиновом коне и наш конь. Погрузили на два воза всё наше имущество и поехали в Гулидово. День был тёплый и солнечный. Дорога, где был снег, а большинство уже была грязь. Ехать надо через Дуниловичи. Пока погрузились и выехали, было, наверное, поздно. Ибо в Дуниловичи приехали под вечер. Дальше ехать не было смысла, и дядя решил заночевать в Дуниловичах у своих швагров Гуйских. Дом их стоял возле реки, а хлев ещё ближе к реке. Возы стояли во дворе, а скот в хлеву. А по другую сторону реки была водяная мельница. Мост с дамбой начинался почти от самого хлева. В этой дамбе заставы были открыты, и вода создавала страшный шум. Река уже была вскрыта, и в реке вода быстро подымалась, так как мост тормозил течение. Мы, разумеется, все*

*спали. Только дяде с мамой не спалось. К полночи вода стала занимать хлев. Вывели коров и лошадей. К рассвету затопило и проезд. На рассвете дядя с противоположной стороны подрубил забор, пока швагры спали, и мы утром по морозику выехали. И после полдня добрались до Гулидова. День опять был тёплый, возле землянки снега не было. Встретил нас Нарцизы. Всё хорошо. Начали располагаться. В землянке были нары, разделены на две половины. Одну заняли мы, а вторая была предназначена для семьи дяди. Он свою семью привёз позже.*

*Хлев для скота был сделан – шалаш с лапок. Кормов почти не было, но было настолько тепло, что коров уже пускали на боровину, где они объедали кусты. Спустя, может, дня три как ударила вьюга, выпал большой снег. Хотя в землянке и была печка "буржуйка", но всё равно было холодно. Правда, дня через два снега опять не стало, и весна вошла полностью в свои права. В землянке не было где печь хлеба. В Лапишках оказалась знакомая семья, Ластовские. Туда мама начала носить хлеб печь. И от этого и пошёл выход из положения. Вскоре распространилось, что Адверт и Эрусь могут наниматься пасти скот. Правда, не навсегда, но только отбывать радовки.*

"Радоўкі" – гэта скарочаная форма слова "чарадоўкі", якое тлумачыла, у якім парадку гаспадары павінны былі пасьвіць жывёлу з усёй вёскі – па-чарадзе.

*Радовок они набрали много, так что дома мало и бывали, и к осени порядком заработали. Мама начала ходить в двор Гулидово на подёнщину. Картошки посадили на земле дяди, так и пробивались. Дядя строил хату, а я бродил один по боровине. Корова была, молоко было, и я хорош. И дядя Павел приезжал однажды, привёз муки и одежду старую своих сынов. Мама распределила, что кому: что Адверту, что Эрусю, и мне тоже кое-что досталось. Были штанишки вроде и неплохие, но мне они почему-то не нравились. И я их никак не хотел одевать. И вот один раз мама не на шутку заставила меня одеть их. Хотя и хворостиной меня отстегала, я всё-таки не одел. А когда*

*дядя приказал, пришлось одеть. Одел и пошёл на боровину до коров. Коровы лежали. Я снял штанишки и бросил на пень, а сам в одной рубашонке занялся гульнёй. Вскоре коровы встали, и корова дяди подошла, начала их нюхать, потом замела языком и начала жевать. Хотя мне их и жалко стало, но я боялся коровы и не попытался отбирать. Так, в одной рубашонке, пробыл до вечера. Вечером мама не обратила внимания, а на утро уже их не нашла, и я молчал. Только через некоторое время, когда нашли на боровине их пожёванные клочья, тогда разгадали загадку, и я был вынужден сознаться. Так прошло лето.*

*К осени был построен дом. Перешли жить в дом. Мы поместились в кухне. Во второй половине, более просторной, дядя начал делать поливу, а сами поместились в отдельной боковке, где было лучше оборудовано. Шишчиха, то есть дядина, начала возить поливу продавать по деревням и в Дуниловичи. Полива, вернее, посуда с глины, была красивая и дорогая. Дядя имел за неё хорошую выручку. Вот в один прекрасный осенний день, была уже довольно поздняя осень, на дворе были заморозки. Дядина ещё на нашем коне поехала на базар со своим товаром. Дядя, как обычно, по базарам сам не ездил. Он всё время работал на своём производстве. Хотя работал кустарным образом, платил подати. И старался как можно больше иметь выручки.*

*Дядина в этот базар купила свою лошадь. Конечно, и дядя знал, что она будет куплять лошадь. И когда стемнело, начал беспокоиться, что долго нет с базара жены. Часто выходил во двор, на что обратила внимание его дочь, девочка. Он ей ответил: “Сегодня мама купит коника красивого, и у нас будет свой коник”. Так оно и получилось. Приехала довольно поздно. Купленую лошадь ввели в хату и осматривали при хатней лампе. Мне тоже было любопытно. Лошадь была немолодая, но хорошая, рыжей масти. В то время были дома и все мы, то есть Адверд, Эрусь, Анна. И перед этим, когда дядя сказал*

*своей дочке, что они будут куплять коня, наша мама это слышала. И выйдя в кухню к нам, рассказала, что слышала. Поскольку Адверд был старший, больше разбирался, сказал: "Теперь будет легче нашему коню". Но мама встревожилась и говорила вполголоса: "Наверное, нам теперь придётся нашего продавать. Двоих они кормить не будут, а кони теперь, осенью, совсем дёшево". На этом был закончен разговор. И вот, как только окончился осмотр, дядя завёл лошадь в хлев. Вернулся в хату. Начал спрашивать, как она везла воз, ибо дядина домой с базара ехала на своей лошади, а наш бежал рядом, привязанный к оглобле. Она рассказывала, что куплять ей помогал её брат, Гуйский. Когда они уже было собрались ехать домой, к ним подошёл Сивицкий Станислав. Это был двоюродный брат отца моего. Он спросил, ну а как будет теперь с конём Марыли.*

*Дядина ответила: "Это дело её. Нам он больше не надо, а даром я его кормить не буду". На этом разговор и был окончен. И теперь, уже после приезда с базара, вскоре она вышла к нам в кухню и говорит: "Теперь ты, Марыля, продавай своего коня. Нам его нет чем кормить". Так прошла ещё неделя. Мама была женщина тихого нрава, и ей купля и продажа приносила много хлопот. А Сивицкие жили тогда в Жукове, возле Норицы. Мама послала туда Адверта с такой просьбой, что она в следующий базар во вторник поведёт продавать коня. Кабы из них кто был на базаре и помог продать. В следующий вторник мама встала очень рано, как тогда говорили – с первыми петухами. И мы все тоже были скоро на ногах. Мы, конечно, не разбирались во всём, что делалось, особо я. А мама знала, что кони дёшево и надо продать за то, что дадут. Кормить нет чем. У нас ещё в то время была и корова, пёстрая, чёрная с белым. Но на корову мама в болоте нажала серпом осоки. Да и Адверд косой немного помогал, так как они с Эрусем в Лапишках отбывали только радовки и им были свободные дни. Итак,*

*мама всё утро плакала. Потом посадила Адверта верхом и сама сзади пешком отправилась на базар. Выезжали. Было очень рано. Темно, но сухо. Был осенний мороз без снега. Прошла несколько время, рассвело. И мы смотрим в окно – с большака по дорожке к хате едет Адверд верхом, а сзади идёт мама и с ней какой-то человек.*

*Оказалось, что Сивицкий Станислав не пошёл в Дуниловичи на базар, а пошёл к нам в Гулидово с такой целью, что нашу лошадь купят они сами. Встретились где-то за Ласицей и вернулись в Гулидово. Здесь они с мамой договорились, вернее, они по дороге договорились, что Сивицкий заплатит 30 р. золотом за коня и за всю сбрую вместе, поэтому и вернулись. Но а сбруя и колёса нам и так, и так не нужны. Конечно, сбруя и колёса – всё это было добито, изорвано, но запрягать было можно, до сих пор Шишчиха ездила. При таких условиях дяде с дядиной стало не по себе. Коня-то они купили, да их конь без сбруи. Они стали говорить, что: "Мы откупим". Но Сивицкий не уступил, запряг коня и уехал. Теперь у нас от отцовского хозяйства осталась только одна корова. Корова была немолодая, но давала много молока и звалась Зязюля.*

*Так прошла ещё одна зима. Начался 1923 г. К весне этого года дядя забрал к себе своего отца, старого Шишку, с ним было ещё четыре его сына: Альфонс, Нарцизы, Казюк, Фелька и дочь Юзефа. Семьища, страшная теснота, расчёт был таков. Мы, разумеется, живём отдельно, а Шишки одной семьёй начали жить. Молодые будут обрабатывать землю, а дядя только посуду. Сразу начали лепить с глины хлев и хату. Я с Фельком пастил коров, поскольку у нас ещё была корова. Эрусь с Адвертом опять остались в Лапишках отбывать радовки.*

*Так в такой сутолоке прошло лето, считай, целый год. К осени был построен хлев, хата. Дед со своими меньшими детьми перешли жить в ту глинобитку. нам опять посвобод-*

*нело. Но дядиной это всё было не по нутру. И это должен я вам объяснить. Нас наперво взяли они только лишь из-за коня. И, наверное, дядина думала скоро избавиться от этих кутников. Старого Шишку взяли тоже, видимо, с расчёта, что те будут обрабатывать землю. Но как пожили в такой склоке, Шышковачка начала всякими путями допекать и свёкру своему. Короче, старому Шишку и нашей маме – всем было муторно от неё. И деваться некуда ни нам, ни деду. Но дело не в этом. Шишки – народ честный и справедливый. И дяде была своего рода неудача в жизни, что его и заставило, вопреки нежелания дядиной, сделать милостыню и над нами, и над своим отцом. И даже приютить дядю Устина, ну, брата.*

*В двадцатом году, когда в наших краях установилось польское правительство, письма начали ходить в Америку нормально. А в Америке было много нашего народа выехало на заработки. В Европе бушевала Первая мировая война. В Америке в то время фабриканты копили себе миллионы долларов. Таким образом, наш народ в Америке получил работу и хороший заработок. И почти все они скопили несколько денег. А польские помещики, напуганные русской революцией и большевиками (к тому, наша местность была под большевиками и поместья были порядком разорены), помещики начали продавать свои земли. Тогда наши белорусы и хлынули с Америки на родину, начали куплять земли. В одном Гулидове оказалось таких покупщиков несколько. Сидорович купил центр имения, за что звали его "центровый", Конопелько, Лиля и другие.*

У дадзеным выпадку Ліля – гэта прозьвішча чалавека, а не імя жанчыны.

*Так же сделал и Шишко, дядя Эрусь. Их было в Америке два брата: Эрусь и Элезеуш. Эрусь старший, но был холостой, Элезеуш моложе, но был женат и имел уже дитя. Женился в Америке, но тоже на здешней, его жена где-то от Ошмяны. Так они и решили: "Ты – холостой, едь в Польшу, а я с семьёй*

*пока останусь". Шишки как Шишки, всегда осторожные. Если Лиля мне сам говорил, что он с Америки вёз только две бумажки денег по тысяче долларов, и то, в ботинках под стелькой, и револьвер с рук не выпускал. В таком роде везли и другие. А Шишко, хотя револьвер и вёз с собою, но деньги сдал в банк переводом. Те, кто привёз доллары, были очень в выйгрыше, ибо доллары имели большую цену. А дядя с перевода снял уже только польскими военными марками, которые каждый день теряли свою цену. А сдал он долларов больше двух тысяч. И за эти марки он смог только захватить плохонький хуторок, то есть дать задаток в половину стоимости. Тогда написал брату, кабы тот прислал ему 500 долларов для окончания расплаты, с такой целью, что когда приедет Элезеуш, он ему отступит половину хутора. Хутор этот имел 22 гектара. Гектаров 6 пахоты, три – пасеки, что звали боровиной, остальное – болото. Итак, как я выше говорил, нас и отца своего он забрал к себе по своим обстоятельствам. А дед Шишка, разумеется, всё это знал, ибо ему тот сын всё писал.*

Падобна на тое, што І. Сівіцкі тут хацеў напісаць, што дзед Вікеньцій аб усім пісаў свайму сыну Элезеўшу і таму той усё ведаў, але аўтар крыху пераблытаў у тэксьце месцамі свайго дзеда Вікеньція і дзядзьку Элезеўша.

*Знал, что и мать наша овдовела с детьми. А ведь она ему тоже родная сестра. А когда Шишковочка начала так свирепствовать, дед взял и написал в Америку сыну, что Эруся жена, мол, гонит вон. Тогда Элезеуш написал, что: "Я с Америки на родину не поеду. А за то, что я тебе выслал денег, приюти Марылю с детьми, кабы она не валялась по чужих углах и отца до смерти догодуй. А Устину дай кусок земли хотя бы поставить хату". Он исходил из того положения, что наша мать – вдова, дети малые. Пускай поживёт, пока дети подрастут. А Устин имел совсем плохое зрение, без очков совсем не видел, поэтому и этого велел приютить. Вот только после этого дядина перестала нас гнать вон. А уж дядю Эрусю что пришлось вы-*

*терпеть от своей супруги – это только один бог судья. Пока это всё проходило, что я рассказал, так мы уже дожили аж до начала, кажется, 1925 года.*

*Да и 1924 год тоже был несладок. Эрусь пошёл служить на постоянно в Медвёдки. Адверт – в Михалину возле Квачей. Антю мама отдала учиться за портниху в деревню Хверки возле Воропаево. Это от Гулидово километров 17. За учёбу заплатила 10 р. золотом из тех денег, что взяла за коня 30 р. Харчи надо носить свои и на подёнщину надо ходить. Корове сена нажала серпом мало, потому что была ещё вся семья Шишко и всё болото перекосили. А Адверта с Эрусем и Анти дома не было и некому было помочь. Я ещё мал. Тогда договорилась с Адвертовым хозяином, что тот докормит до весны в счёт Адвертовой зарплаты, по два пуда ржи в месяц. Адверд был договорившись 16 пудов ржи, от весны до Рождества, то есть где-то с начала марта до 25 декабря. Корову мама завела с первого декабря. До Рождества кормил Адверд весь скот хозяина и свою. А после Рождества январь и февраль как покормил хозяин, так дал наказ, что корова не хочет вставать. Да и к отёлу начало подходить время. Правда, ещё мама привела домой. Но вскоре корова не стала вставать совсем. Отелилась. Уже не вставала. Телёнка вскоре пришлось зарезать, так как лежачую корову ему было плохо сосать. Ещё несколько время мама доила лежачую, но она уже плохо ела и молоко почти перестала давать. Лечение ей никакого не было смысла оказывать. И вот одно воскресенье, был, наверное, апрель 1925 г.*

*Мама понесла Анте харчи в Хверки. Шишки почти все были ушедшие в Константиново в костёл. Дома был только я один. День был весенний. Погода. Светило солнце. Снега уже не было, была только грязь. Я бегал босиком и вздумалось мне посмотреть корову, ибо я уже хорошо понимал, что корова больна, и слышал разговор мамы, что корова, наверное, сдохнет. Я заглянул в хлев, наша корова лежала отбросив голову и*

*бока её сильно вздувались. Я как-то испугался, захлопнул хлев и убежал на боровину. Там занялся гульнёю и всё для меня было нормально. А через некоторое время я прибежал в хату. Я застал маму сидя за столом на лаве и мама плакала. Я, разумеется, смутился, начал спрашивать, чего мама плачет. И мама сказала, что у нас больше нет коровы, что наша корова сдохла. Я побежал в хлев. Корова лежала в такой позе, в какой я её видел в последний раз, с отброшенной головой. А возле неё на навозе лежали лопухи с зелёными листьями и жёлтыми цветами. Их была порядочная кучка. Это мама на обратном пути од Анти насобирала корове, но они уже были не нужны. Это пропало последнее то, что было ещё от отцовского хозяйства.*

*Лето 1925 года особо ничем не отличалось от других подобных летних месяцев. Разве только та разница, что все молодые Шишки разошлись служить по людях, так, как и мои братья. Остался только старый дед Шишка и его меньшая дочка Юзефа, она была мне ровесница. Мама как обычно ходила внаём ежедневно, а я целыми днями бродил по боровине, почти впроголодь. Иногда дед подкармливал, но обо мне отзывался плохо. Только и называл гицаль – мошенник. И для этого была причина, по его мнению, не малая. Дед был очень набожный. Его в любое время дня можно было видеть за молитвой. Он вслух напевал божественные гимны. А хуже всего было для меня то, что дед считал своим долгом довести меня до веры божьей, как он выражался. Правда, в этом и мама не забывала. Каждое утро и вечер, когда только маме время позволяло, я должен был становиться на колени и повторять за ней "Отче наш". И так далее. Потом "Здровась Мария", потом "Вежен в бога отца" и на конец 10 божьих заповедей. И это мне было тяжёлой обязанностью. Но маме я никогда не прекословил и терпеливо переносил свой крест. А в небо всё-таки хотелось, хотя я был и мал. А с дедом дело было хуже. Я почти всегда хотел есть, а дед это знал. Стоило мне только забежать к*

*деду, как он сразу предлагал поесть. Разумеется, оладьями не лакомил, но я и супом был доволен. А после этого ставит на колени меня и свою дочку, и начинает: от крестового знамения, то есть “Во имя отца и сына, и святого духа. Аминь.”, и дальше пошли молитвы. Потом всевозможные законы божьи. Это занимало много время, а деваться некуда. А сам дед в это время что-нибудь делает, или деревянные ложки, или ещё что-нибудь. Я в это время смотрю зорко. Как дед отвлёкся, я тогда даю дёру, или начинаю корчиться, что мне надо по естественному пути. Тогда дед переключается на другую “молитву” и пошло: гультай, бестия, паршивая шея и так дальше. Вот только это и не давало жить с дедом в ладах.*

*А для меня был другой выход. Когда дядина расправилась со всеми молодыми Шишками, всех из дома выжила, деда поместили в особую хату. Тогда дядина взяла к себе в дом своего родного брата Гуйского для обрабатывания земли. Ему было лет 17. Я с ним подружился. Когда он пахал плугом землю, я ходил рядом. Когда возил сено, я топтал возы. А он мне украдёт у своей сестры кусок хлеба. А если удастся, то и маслом помажет. Кроме того, уже и в горохе выросли струки. Я забирался в горох и ел, а дядина, как увидит мою голову в горохе, ну тогда беда. Вечерами, когда мама приходила с подёнщины, если работала у центрового, то обычно приносила молока и хлеба. Да какого хлеба, белого, хорошего.*

У гэтым месцы варта зрабіць адступленьне ад мемуараў І. Сівіцкага для неабходнага кампаратыўнага аналізу. У савецкую эпоху было прынята ўсемагчымым чынам усхваляць усе дзеяньні савецкай улады і той лад жыцьця, які яна ўсталявала ў падкантрольных ёй краінах. У тым ліку і ў БССР. І, наадварот, лад жыцьця ў іншых краінах, асабліва несацыялістычных, гэтаксама татальна крытыкаваўся. У тым ліку і ў другой, польскай Рэчы Паспалітай. Адпаведна, абсалютная большасьць насельніцтва тагачаснай Польскай дзяржавы ў выглядзе працоўных і сялян апрыёры абвяшчалася няшчасным і прыгнечаным класам, які рана ці позна ўсё роўна быў бы вызвалены

ад сваіх буржуінаў-прыгнятальнікаў і паноў-скуралупаў неперамож-най Чырвонай Арміяй-вызваліцельніцай (нават калі гэта і не ўдалося зрабіць у 1919-1921 гг.). Прычым гэта датычылася не толькі карэн-нага польскага насельніцтва, але і яго этнічных меншасьцяў у вы-глядзе беларусаў і ўкраінцаў, якія насялялі ўсходнія ўскраіны Польскай дзяржавы.

Але на сёньняшні дзень мы, дзякуй богу, ужо пазбавіліся ад улады савецкага рэжыму і цяпер мы можам больш рэальна зірнуць на тыя ўмовы жыцьця, у якія трапілі нашыя продкі па абодва бакі міждзяржаўнай мяжы, якая падзяліла нашу радзіму падчас яе акупа-цыі савецкай і польскай дзяржавамі. Дадзеныя ўспаміны Іосіфа Сі-віцкага даволі поўна і адносна аб’ектыўна адлюстроўваюць карціну жыцьця беларусаў заходняй Беларусі пад уладай польскай дзяржавы. Безумоўна, трэба ўлічваць наяўнасьць сімпатыі аўтара ўспамінаў да савецкай улады, якая, хутчэй за ўсё, была зьвязана з тым матэрыяль-ным становішчам, у якое трапіла сям’я І. Сівіцкага падчас яго дзя-цінства. Праўда, як ён сам зазначае, іх сям’я жыла нядрэнна, пакуль жыў бацька і ў сям’і была магчымасьць апрацоўваць зямлю, нават калі яна была чужая і за гэта трэба было аддаваць частку ўраджаю. Абапіраючыся на гэта, можна зрабіць хай і ўмоўную, але выснову, што беларускі селянін у тагачаснай польскай дзяржаве, нават толькі апрацоўваючы чужую зямлю, ужо мог забясьпечыць сабе адносны дабрабыт. Цалкам лагічна меркаваць, што, маючы сваю асабістую зямлю, заходнебеларускі селянін меў яшчэ большыя шанцы на па-ступовае ўзбагачэньне.

Але гэта разважаньне з’яўляецца усяго толькі адвольным тэа-рэтызаваньнем, якое абапіраецца толькі на адну сялянскую сям’ю з Пастаўшчыны, якая па волі лёсу трапіла ў неспрыяльную сітуацыю. А як жа ў цэлым выглядала сітуацыя з сялянскім пытаньнем на Па-стаўшчыне? Возьмем некалькі лічбаў. Па стане на 1920 г. на сялян-скую гаспадарку ў Заходняй Беларусі прыходзілася ў сярэднім каля 7 га зямлі. Нельга сказаць, што гэта мала. Але трэба ўлічваць, што пры гэтым існавала невялікая колькасьць буйных землеўладальнікаў, якія зусім не гарэлі жаданьнем разьвітацца са сваёй зямлёй, і вялікая колькасьць увогуле беззямельных парабкаў, накшталт маіх продкаў Шышко і далёкіх сваякоў Сівіцкіх. Праўда, зыходзячы з аповяду І.

Сіверцкага бачна, што адсутнасьць зямлі ў селяніна яшчэ не азначала, што ён – бедны жабрак. Пры спрыяльных умовах і асабістай працавітасьці такія парабкі маглі адносна нядрэнна зарабляць і жыць. Але чыста аб’ектыўна без асабістай зямлі кожны такі парабак знаходзіўся ў свайго роду “падвешаным” стане, што не ёсьць добра.

Гэту акалічнасьць улічыў польскі ўрад, які ў сярэдзіне 20-х гадоў правёў вядомыя нам камасацыю і парцэляцыю. Камасацыя – гэта, па сутнасьці, лагічны працяг Сталыпінскай рэформы. З той толькі розьніцай, што цяпер беларускіх сялян ніхто ўжо не перасяляў у Сібір, таму перанаселенасьць беларускай вёскі заставалася актуальнай праблемай. Але колькасьць аўтаномных сялянскіх гаспадарак-хутароў усё роўна павялічвалася. А парцэляцыя – гэта прымусовы выкуп дзяржавай зямлі ў буйных землеўладальнікаў з мэтай далейшага продажу гэтай зямлі жадаючым сялянам. Тут вельмі важна адзначыць дзеяньні польскай дзяржавы: яна кіравалася тым меркаваньнем, што зямля павінна не бескарысна ляжаць ва ўладаньнях памешчыкаў, а абавязкова апрацоўвацца сялянамі. Але для дасягненьня гэтай мэты польскі ўрад выкарыстаў не знакаміты лозунг Шарыкава “адабраць і падзяліць”, а той прынцып, што ўсё ў гэтым жыцьці мае цану. Таму і зямля ў памешчыкаў не канфіскоўвалася “імем рэвалюцыі”, а менавіта выкуплівалася за грошы. І сялянам, у сваю чаргу, яна таксама прадавалася за грошы. Чалавечая псіхалогія заўсёды больш цэніць тое, за што мы вымушаны былі нешта заплаціць, чым тое, што нам дасталося дарма.

У выніку ўсіх гэтых рэформаў сярэдні памер сялянскай гаспадаркі на Пастаўшчыне вырас з 7 да 10 га. А 10 га – гэта ўжо не так і дрэнна для забесьпячэньня сям’і. Безумоўна, 10 га – гэта толькі сярэдняя лічба, а фактычна з 21 тыс. сялянскіх гаспадарак каля 36% гаспадарак мелі толькі да 4 га зямлі, каля 37% – ад 5 да 10 га, і толькі каля 27% валодалі надзеламі ад 10 да 500 га і больш. Гледзячы на гэтыя лічбы, лёгка здагадацца, што медыяна, якая з’яўляецца больш дакладным паказальнікам зямельных надзелаў сялянскіх гаспадарак на Пастаўшчыне, будзе меншай, чым сярэдняе арыфметычнае. Тым не менш фактам застаецца тое, што цяпер хай і не нашмат, але сярэднезаможных гаспадарак стала больш, чым малазямельных. А гэты факт вельмі істотна зьніжаў тую сацыяльную напружанасьць на

вёсцы, якая існавала на беларускіх землях яшчэ з часоў расейскай акупацыі.

Праўда, калі мы ўважліва пачытаем успаміны І. Сівіцкага, то заўважым, што нават валоданьне вялікімі надзеламі зямлі яшчэ не гарантавала аўтаматычнай заможнасьці. З тых 22 га, што купіў сабе Шышко Эразім, эфектыўна можна было выкарыстоўваць толькі 9 га. Астатнія 13 га былі забалочанымі. Гэту акалічнасьць таксама трэба ўлічваць, каб разумець, што колькасьць зямлі не заўсёды аўтаматычна разумее пад сабой яе якасьць. І пачынаць новае жыцьцё на гэтым кавалку зямлі гаспадарам давялося ўвогуле ў зямлянцы.

Плюс да гэтага трэба адзначыць і агульную гаспадарчую палітыку тагачаснай польскай дзяржавы. Калі ў плане сельскай гаспадаркі польскі ўрад праводзіў у цэлым станоўчыя пераўтварэньні на беларускіх землях, то ў плане прамысловасьці сітуацыя выглядала істотна горш. Асноўны напрамак прамысловых інвестыцый польскай эканомікі быў скіраваны на этнічна польскія землі, пакідаючы нашым этнічна беларускім “крэсам” ролю сельскагаспадарчага дадатку да прамысловага цэнтра. Гэта адзін з тых фактараў, які дазваляе вызначыць польскую ўладу на беларускіх землях як акупацыйную, таму што сапраўдная нацыянальна арыентаваная ўлада заўсёды клапоціцца аб раўнамерным разьвіцьці ўсіх рэгіёнаў сваёй краіны.

Крыху разгледзеўшы стан сялянства ў Заходняй Беларусі, для больш поўнай карціны варта зьвярнуць увагу на тое, як у сярэдзіне 20-х гг. жыў беларускі селянін у БССР. Там зямлю сялянам, у адрозьненьне ад польскай дзяржавы, не прадавалі, а раздавалі за так (не забываем несьмяротнае “адабраць і падзяліць”). Па сутнасьці, адбывалася тая ж самая парцэляцыя, толькі, як у нас сёньня прынята казаць, “на халяву”. Раздавалі былыя панскія землі і адразалі кавалкі зямлі ў тых сялян, якія яе мелі, на погляд тагачаснай савецкай улады, зашмат. Паралельна ў гэты ж самы час у БССР адбываўся і працэс хутарызацыі сялянскіх гаспадарак. Зноў-такі, тая ж самая камасацыя, што і ў Заходняй Беларусі, працяг Сталыпінскай рэформы.

Праблема перанаселенасьці вёскі ў БССР была такой жа самай актуальнай, як і на захадзе Беларусі, а зямлю, паводле Ленінскага дэкрэту, трэба было даць кожнаму. У выніку, каб хапіла на ўсіх, ка-

валкі даводзілася рабіць драбнейшымі. Што ж атрымалася ў выніку рэалізацыі лёсавызначальнага прынцыпу: “адабраць і падзяліць”? Да ліку бедных сялян былі аднесены беззямельныя парабкі або ўладальнікі надзелаў да 2 га. Колькасьць такіх гаспадарак у сярэдзіне 20-х гг. складала каля 31%. Параўнаем гэтыя лічбы з заходнебеларускімі: 0-4 га і каля 36% адпаведна. Безумоўна, не маючы поўных статыстычных дадзеных, нельга сьцьвярджаць вызначана, але ўсё ж такі возьмем на сябе такую сьмеласьць меркаваць, што каб на захадзе Беларусі да бедных гаспадарак прылічваліся тыя, якія мелі толькі да 2 га, то іх колькасьць была б менш за 31%, як у БССР.

Ідзем далей. Сярэднезаможнымі гаспадаркамі ў БССР лічыліся з надзелам зямлі ад 2 да 6 га. І іх колькасьць дасягнула прыкладна 65% ад усіх. Параўноўваем з Пастаўшчынай: 5-10 га і 37% адпаведна. У дадзеным выпадку розьніца выглядае яшчэ больш уражлівай. Там, дзе ў БССР “серадняк”, умоўна кажучы, толькі заканчваўся на 6 га, “серадняк” у Заходняй Беларусі толькі пачынаўся з 5 га. І тут нават не дапамагае колькасная перавага “сераднякоў” з усходу, якіх было 65%. Мы ўжо ўбачылі, што колькасьць бедных сялян на ўсходзе і захадзе Беларусі была прыкладна роўная. А гэта азначае, што тая розьніца паміж “сераднякамі” ў 18% (65% мінус 37%) у Заходняй Беларусі аўтаматычна пераносіцца на вышэйшы маёмасны ўзровень, да ліку заможных сялян, “кулакоў”.

У БССР “кулакамі” лічыліся сяляне, якія мелі звыш 6 га зямлі. Іх налічвалася ўсяго толькі каля 4%. У Заходняй Беларусі да “кулакоў” можна было аднесьці сялян, якія валодалі ад 10 да 50 га. І іх колькасьць ад агульнай колькасьці землеўладальнікаў складала каля 26%. Калі гэтыя лічбы – ад 6 га 4% і 10-50 га 26% – паставіць побач, то бачная розьніца настолькі вялікая, што ўсякія каментары тут будуць проста лішнія. Для паўнаты карціны трэба ўзгадаць, што каля 1% землеўладальнікаў у Заходняй Беларусі мелі ўчасткі зямлі памерам больш за 50 га, але так як іх колькасьць была невялікай у параўнаньні з астатняй масай сялян, то іх зямельныя ўладаньні ўжо не складалі тую істотную частку зямельнага фонду, як гэта было ў часы царскай Расеі.

Як жа даводзілася на такіх невялічкіх лапіках зямлі выжываць беларускім сялянам у БССР? Для прыкладу прывядзём ліст селяніна

з хутара Лебедзеўка Кармянскага раёна ў рэдакцыю часопіса "Плуг", напісаны ў 1926 г.: "Вярнуўся з Чырвонай Арміі ў сьнежні 1921 г. А тут зямлю былую панскую дзеляць на пасёлкі і хутары. Застаўся кавалак у тры дзесяціны (1 дзесяціна = 1,09 га), які ніхто не хацеў браць: зямля самая кепская. Я падумаў і падаў заяву на гэты кавалак. Калі сталі зацьвярджаць зямлю, то ў маіх суседзяў знайшлі лішак. На маю долю выпала яшчэ паўтары дзесяціны. Але суседзі мне ўсё не аддалі, за палову дзесяціны трэба яшчэ судзіцца. Як атрымаў гэту зямлю, пачаў яе апрацоўваць: капаць карчы, вырываць хмызьнякі, зразаць купіны і бугры. Тут увесь ворыўны пласт і сьцягнуўся, да самага пяску. Тады я на гэтыя плямы паклаў торф напалову з гноем. Прывёў зямлю да ладу, цяпер яна родзіць аднолькава паўсюль. Фактычна гаспадарку заводзіў зусім з нічога, а цяпер маю новую хату, хлеў, паветку, сьвіран, склеп, каня, дзьве каровы".

Як мы бачым, маючы ў карыстаньні толькі 4 га зямлі, за 5 гадоў селянін здолеў амаль з нічога стварыць для сябе гаспадарку. Лагічна меркаваць, што ў Заходняй Беларусі магчымасьці сялян былі прыкладна такія ж. Тым больш, што сярэдняя колькасьць зямлі на адзін сялянскі надзел, як мы бачылі вышэй, атрымлівалася большай, чым у БССР. Узьнікае, праўда, пытаньне: як так атрымалася, што пры адносна аднолькавай шчыльнасьці насельніцтва ў Заходняй Беларусі і БССР зямельны надзел заходнебеларускага селяніна атрымліваўся большым за надзел селяніна з БССР? Дакладнага адказу на гэта пытаньне пакуль што няма. Але чыста тэарэтычна можна меркаваць, што такая сітуацыя атрымалася па той прычыне, што ў БССР савецкая ўлада імкнулася пароўну надзяліць зямлёй усіх сялян без выключэньня, што пры абмежаваным тагачасным зямельным фондзе аўтаматычна вяло да здрабненьня зямельных надзелаў. А польская ўлада не давала за так зямлю, а толькі прадавала тым, хто купіць мог і хацеў. У выніку ў Заходняй Беларусі засталася хоць і не такая вялікая, як раней, але ўсё ж такі значная колькасьць беззямельных парабкаў. Адпаведна, больш заможныя сяляне маглі дазволіць купіць сабе большыя кавалкі зямлі за кошт беззямельнасьці іншых.

Падсумоўваючы першыя вынікі разгляду сацыяльна-эканамічнага ладу ў абедзьвюх краінах, паспрабуем зрабіць папярэднія высновы: дзе ж беларускім сялянам жылося лепш? З аднаго боку, у

БССР кожнаму жадаючаму было лягчэй атрымаць зямлю для свайго самазабесьпячэньня. Але ў выніку перанаселенасьці вёскі гэтай зямлі хапала толькі-толькі каб пракарміць сваю сям'ю. З другога боку, Польская дзяржава, хоць і палегчыла сялянам магчымасьць набыць зямлю, але ўсё роўна пакінула рынкавы прынцып эканамічных узаемаадносін усіх суб'ектаў гаспадараньня. Такім чынам, тыя сяляне, якія не маглі або не хацелі набываць сабе зямлю, былі вымушаны шукаць сабе працу ў гарадах. Тым самым Польская дзяржава не толькі надала імпульс разьвіцьцю сваёй сельскай гаспадаркі, але і пакінула далей працякаць натуральнаму працэсу паступовага адтоку насельніцтва з вёскі ў горад. Гэта ў сваю чаргу стварала большы рынак працоўнай сілы ў горадзе, што пазітыўным чынам адбівалася на разьвіцьці прамысловасьці.

Таму калі разглядаць узьдзеяньне дзяржаўнай палітыкі на сельскую гаспадарку ў абедзьвюх дзяржавах, то можна прыйсьці да высновы, што польскі накірунак у далёкай перспектыве разьвіцьця эканомікі ў цэлым быў усё ж такі больш рацыянальны, чым савецкі ў сярэдзіне 1920-х гг. Але, як мы ўжо адзначалі вышэй, прамысловае разьвіцьцё ў Польскай дзяржаве засяроджвалася збольшага ў этнічна польскіх землях. Па гэтай прычыне нашы беззямельныя сяляне былі вымушаны сыходзіць у пошуках працы часьцей не ў беларускія гарады, а ў польскія ці ўвогуле з'язджалі за мяжу. Праўда, дзеля аб'ектыўнасьці трэба заўважыць, што і з БССР сяляне таксама з'язджалі ў пошуках лепшай долі. Або ў расейскія гарады, або шукалі свабодную зямлю ў Сібіры, каб і надалей займацца сваёй сялянскай працай.

Акрамя таго, савецкая сістэма абавязковага і адносна роўнага надзяленьня сялян зямлёй мела і іншыя, не зусім добрыя наступствы для бальшавікоў у іх імкненьні распаўсюдзіць камунізм па ўсёй планеце. Як мы раней ужо бачылі, для рэалізацыі сваіх мэтаў бальшавікам абавязкова трэба было прабіцца з аграрнай, па сутнасьці, Расеі ў прамыслова разьвітую Еўропу. Але ў 1919-1920 гг. на іх шляху апынулася Польшча, падтрыманая заходнімі дэмакратыямі, перамагчы якую тагачаснай Чырвонай Арміі сіл не хапіла. Трэба было яе тэрмінова ўзмацняць. Зрабіць гэта можна было толькі за кошт хуткага разьвіцьця савецкай прамысловасьці, асабліва цяжкай. Але ў адрозь-

неньне ад зямлі, якую было лёгка адбіраць і дзяліць, цяжкую прамысловасьць трэба было ствараць, бо прамысловай спадчыны царскай Расеі яўна не хапала для грандыёзных камуністычных задумаў планетарнага маштабу.

Тут бальшавікі сутыкнуліся з новай вялікай праблемай: дзе ўзяць вялізарныя сродкі для стварэньня шматлікіх заводаў і фабрык? Прычым гэтыя сродкі трэба было знайсьці як мага хутчэй, бо год ад году заходні сьвет пакрыху адыходзіў ад жахлівых наступстваў Першай сусьветнай вайны і, адпаведна, чым лепш жыло заходняе грамадства, тым папулярнасьць камуністычных ідэй у ім падала ўсё больш. Калісьці царская Расея знаходзіла гэтыя сродкі за кошт прыцягненьня ў сваю эканоміку замежных інвестыцый. Але савецкая дзяржава не магла выкарыстаць гэты рэсурс, таму што любы інвестар зацікаўлены ў валоданьні тым прадпрыемствам, у якое ўкладае грошы. А ў СССР валодаць прамысловымі аб'ектамі мог толькі дзяржаўны бюракратычны апарат (ну, вядома, схаваўшыся за папулісцкі лозунг “заводы – працоўным”). Таму замежныя інвестыцыі адпадалі.

Калі не праз інвестыцыі, то можна было б яшчэ і самім штонебудзь стварыць, але неабходнага прамысловага абсталяваньня катастрафічна не хапала для буйнамаштабнага будаўніцтва. Усё гэта абсталяваньне ў любых колькасьцях можна было б набыць на тым самым Захадзе, бо, хоць юрыдычна СССР яшчэ не прызнавалі, але бізнес ёсьць бізнес, і гандляваць з Савецкім Саюзам ахвотнікі былі. Праўда, гандляваць трэба было за валюту тых краін, у прадукцыі якіх бальшавікі былі зацікаўленыя. Таму, па ўсіх законах рынка, для таго, каб гэту валюту набыць, спачатку трэба было нешта за яе прадаць. Што мог прадаць СССР прамыслова разьвітаму Захаду? Толькі тое, што ўжо стагоддзямі прадавала да гэтага Расея: выключна сыравіну. Між іншым, і сельскагаспадарчую, якая складала вялікую долю ў раней расейскім, а цяпер савецкім экспарце.

Ці шмат сельскагаспадарчай сыравіны, у першую чаргу зерневых, мог выставіць на продаж СССР у сярэдзіне 1920-х гг.? Сярэдні надзел зямлі селяніна ў БССР складаў каля 5 га. З гэтага кавалка селяніну трэба было перш за ўсё накарміць сваю сям'ю і ўтрымліваць гаспадарку. На продаж заставалася толькі рэшта здабытых прадуктаў, пасьля таго як сям'я ўжо была забясьпечана. У БССР з яе малазя-

мельлем таварнасьць сельскай гаспадаркі не дасягала нават 15%. Інфармацыі наконт таварнасьці сельскай гаспадаркі ў сярэдзіне 1920-х гг. на тэрыторыі астатняга СССР няма. Тэарэтычна можна меркаваць, што з улікам большай колькасьці свабодных земляў яна была большай, чым у БССР, але наўрад ці намнога. Хай, можа, там яна дасягала нават 20%, але і гэта частка не заўсёды даходзіла да дзяржавы. У 1920-х гг. у СССР быў абвешчаны НЭП, які дазваляў дробную прадпрымальніцкую дзейнасьць. Выкарыстоўваючы гэту акалічнасьць, сяляне з большым задавальненьнем прадавалі свае здабыткі на рынку, які даваў магчымасьць больш зарабіць, чым дзяржаве за тыя фіксавана нізкія цэны, якія яна прапаноўвала. Цэны, вышэйшыя за рынкавыя, дзяржава сялянам прапанаваць не магла, бо ў такім выпадку кошт на дадзеную прадукцыю ўзьняўся б настолькі, што СССР не змог бы прадаць яе капіталістычным краінам, каб атрымаць такую патрэбную валюту для правядзеньня індустрыялізацыі.

Паступова ў СССР стала складвацца сітуацыя, што эканамічныя імкненьні сялян, якія складалі большую частку насельніцтва краіны, прыйшлі ў вострую супярэчнасьць з бальшавіцкай ідэалогіяй і спробамі яе рэалізацыі. Так матэрыяльны стан сярэднестатыстычнага селяніна з году ў год станавіўся ўсё лепшы і ўжо пераўзышоў узровень 1913 г. І рост прамысловасьці таксама назіраўся. Па прычыне нарастаючага свайго дабрабыту сяляне маглі паступова ўсё большую частку сваіх прадуктаў выстаўляць на рынак, стымулюючы тым самым і рост прамысловай прадукцыі. Але гэты працэс адбываўся паступова, і на рынку сяляне куплялі пераважна прадукцыю лёгкай прамысловасьці, стымулюючы да далейшага разьвіцьця менавіта гэтыя прамысловыя галіны. Гэта азначала, што ў перспектыве праз некалькі дзесяцігоддзяў павінна была адбыцца індустрыялізацыя савецкай эканомікі звычайным эвалюцыйным шляхам, без пагаршэньня дабрабыту насельніцтва.

Але для бальшавікоў гэта было занадта марудна. Па-першае, было зразумела, што за гэтыя бліжэйшыя дзесяцігоддзі вырасьце дабрабыт не толькі савецкіх грамадзян, але і жыхароў разьвітых капіталістычных краін. Адпаведна і папулярнасьць камуністычных партый у тых краінах будзе планамерна падаць. А гэта азначала такое ж

самае зьніжэньне шанцаў на перамогу ў адкрытым вайсковым сутыкненьні з тымі краінамі, калі бальшавікі зноў рушылі б на іх Чырвоную Армію. Таму каб не губляць час, трэба было як мага хутчэй рыхтаваць новую, на гэты раз ужо механізаваную Чырвоную Армію, для чаго неабходна была не паступова-эвалюцыйная, а хуткасная, фарсіраваная індустрыялізацыя. І, па-другое, тая паступова-эвалюцыйная індустрыялізацыя, якая склалася падчас НЭПа, як мы ўжо казалі, была ськівавана на патрэбы большай часткі насельніцтва, то бок сялян. Таму ў першую чаргу разьвіваліся менавіта лёгкія галіны прамысловасьці, у той час як для матарызаванага забесьпячэньня Чырвонай Арміі бальшавікам патрэбна была больш за ўсё цяжкая прамысловасьць, і перад усім машынабудаваньне. А сяляне, як назло, лішкі сваёй прадукцыі несьлі не дзяржаве за капейкі, а на рынак. Тым самым савецкая дзяржава пазбаўлялася той таннай сельскагаспадарчай сыравіны, за кошт якой можна было б за мяжой набываць усё неабходнае абсталяваньне для разьвіцьця цяжкай прамысловасьці.

Такім чынам, мы бачым, што ў СССР у сярэдзіне 1920-х гг. савецкая ўлада прыйшла ў яўны ідэалагічны канфлікт з сялянствам. Бальшавікі марылі пра пабудову свайго ўтапічнага камуністычнага грамадства на ўсёй планеце. У той час як сяляне, якія ў сваёй большасьці нават чытаць не ўмелі, з усёй камуністычнай праграмы зразумелі толькі адно: “зямля – сялянам”. І ўсё. Тлумачыць ім розныя асаблівасьці дыялектычнага матэрыялізму можна было б з тым самым посьпехам, як ад нараджэньня сьляпому чалавеку тлумачыць, чым зялёны колер адрозьніваецца ад чырвонага. Камуністы паабяцалі сялянам зямлю ў выпадку сваёй перамогі. Сяляне дапамаглі камуністам перамагчы. Камуністы далі зямлю сялянам. На гэтым кантракт быў выкананы і кожны атрымаў тое, аб чым дамаўляліся раней. Так думалі сяляне. Але зусім не так думалі таварышы камуністы.

*Вот таково было моё детство. Так прошёл 1925 год. Начался 1926 год. Пришла зима, Рождество, Новый год. На время вернулись Адверд с Эрусем. Привезли их хозяева и их зарплату – зерно, рожь. Договорились опять, на второй год. Они дома побыли недели две и пошли опять к своим хозяевам. Антя всё ещё учится шить. Хлеба у нас есть, жить стало хорошо.*

*Мама зимой дома. Я уже молитвы знаю назубок, да и законы божьи тоже подучил. Дошло дело до грамоты. Дядя Эрусь вырезал мне из картона азбуку латинскую, ибо Польша живёт на латинской азбуке. Кажется, 36 букв. Сначала мне их раскладывала мама, надо было по порядку. Но и я начал изучать, потом и сам раскладывать. Понял и зазубрил. Разумеется, на это ушла вся зима.*

*Пришла весна. Мама опять ушла на подёнщину. Мне уже исполнилось девять лет. И вот одно воскресенье к нам приехал человек верхом на серой лошади. Это был с Ласицы Скворцевич Фома. Дядя Крамичевой Теси. Он слыхал, что здесь можно нанять пастушка. Поскольку Адверта с Эрусем не было, да они ему были и завелики, речь пошла про меня. Мама меня позвала и показала хозяину. Он посмотрел на меня, начал со мною разговаривать. Начал объяснять маме, что у него надо пастить четыре коровы и овцы. Дело на хуторе. Что я могу вполне справиться. Да, говорит, и мой мальчик ему будет помогать. На чём и сошлись. Сгодились 8 пудов ржи до осени, ибо надо и про школу подумать. Хотя в то время школы близко не было, но были разговоры, что должны где-то школу поблизости открыть.*

*Хозяин этот большого привлекательства мне не внушал. Был пожилой. Лицо безусое, а сморщенное, как печёный яблок. День был хотя весенний, уже и травка зеленела, но был пасмурный и моросил дождь с перерывами. Когда я убедился, что мне надо идти в чужую семью, мне стало не по себе. Я как-то сжался, но не плакал. Вышли во двор, он сел верхом на лошадь, а меня посадил спереди. Так мы и тронулись с места. Мама пообещала через две недели придти меня проведать.*

*Итак, я очутился в чужой семье.*

*Началась для меня новая эра моей жизни. Хутор этот оказался по другую сторону Пилаихи. Этой самой Пилаихи, в которой после Зюник дезертировал.*

Пілаіха – гэта назва невялічкага пералеску ў той мясцовасьці.

*Семья как семья. Крестьянская, довольно неприветливая. Было семь душ: хозяин с хозяйкой, четверо детей и хозяйки племянница, нянька, ибо один мальчик был ещё в колыбели. А старший сын хозяина оказался на год старше за меня. Ему было 10 лет. Разумеется, что я в такой семье оказался как зверёк в клетке. А что худшее, это было, что хозяева сами с собой часто ругались. Да и детей своих больших он часто лупил ремнём, отчего я тогда совсем просто ник. Хотя он мне и говорил "ты не бойся", но я обычно дрожал. Правда, за эти две недели, пока пришла мама, мне такой передряги не было, они ни разу не ругались. Когда пришла проведать меня мама, заночевала. И мы с нею на печке спали. Маму очень огорчило то, что его сын больший и дома, а я меньший и должен пасти их скот. Мама мне говорила: "Если тебе плохо, пойдём домой". Мне, конечно, хотелось домой, но я не решился это сказать. Утром скот выгнали. Мама побыла со мною в поле. Я её ободрил, что мне неплохо. Распрощались, и ушла. Уходя, заплакала. Я держался до тех пор, пока мама не скрылась за кустами. Когда мама скрылась, тогда у меня хлынули слезы, и я так от души поплакал. Не только тот день, но и после, когда я со своими коровами попадал на это место, где мы расстались с мамой, я всегда там плакал. Жизнь моя была нерадостная. Хозяина сынок не только мне не помогал, так он ещё порядком мне досаждал. Одно, что он был сильнее меня и физически мне досаждал.*

*Второе, он всегда командовал. А я от колыбели был непривычен к подчинению. Кроме того, всегда ябедничал своим родителям на меня. В таких условиях я прожил до конца 1926 года.*

Дакладней будзе сказаць, з сакавіка да канца верасьня 1926 г. Усяго каля 7 месяцаў.

*В этом году в Лапишках открыли поляки школу. Дом был нанят частный. Хотя школа начала работать с первого, но*

*мама пришла по меня в конце сентября. И, согласно договору, хозяин меня отпустил. Одежонку кой-какую мама справила. Разумеется, кроме сапогов и пальто. Лето всё я проходил босиком. О мытье моих ног никому и в голову не приходило. Да и я сам не обращал внимания на свои ноги. Когда дождь идёт, я бегаю по мокрой траве, по лужицам, ноги немного побелеют. Зато после дождя я с удовольствием мешу ногами всевозможную грязь, и они у меня в таком виде засыхают. Словом, мои ноги имели естественный вид земли. Когда мама начала меня готовить идти в школу, первый вопрос возник – вымыть ноги. Ибо в школу не только я, а все сплошь ходили босиком, пока было тепло. А когда наступали холода, то пятьдесят процентов учащихся ходили в лаптях, 25 пр. в деревяшках, это было лучше лаптей. А только 25 пр., сыночки кулаков или зажиточных, были в сапогах.*

*Итак, я начал мыть свои ноги. Мыл я целый день, в несколько приёмов. Вместо мыла мне служила трава, высокая, с розовыми цветами. Эта трава давала немного пены, и люди её считали мыльной, и все для мытья употребляли. Вот и я усердно пользовался, не жалея ни травы, ни ног. И к вечеру мои ноги стали только синее.*

Мыльная трава, якой маленькі Іосіф мыў свае ногі, – гэта трава мыльнянка лекавая (лац. Saponaria officinalis, ад лац. sapo — мыла). У мінулым у аптэкарскіх крамах бойка гандлявалі коранем мыльніка і як лекавым сродкам, і як “мыльным коранем” для мыцця ваўняных і шаўковых вырабаў, а таксама для вывядзеньня плямаў на вопратцы. Ужывалі яе і як хатні касметычны сродак. Але так як гэтая трава ўтрымлівала адносна агрэсіўныя хімічныя рэчывы, то Іосіф, так старанна мыючы свае ногі, крыху “падпаліў” іх гэтай травой.

*Разумеется, кроме этого, ещё и всего меня мама вымыла в корыте. И дядя подстриг наголо ножницами. Голова была гола, как качан капусты. Только рады были от ножниц. Настроение моё было непонятное: и хотелось, и страшно было. Словом, после всех подготовок к вечеру я себя чувствовал как*

*перед праздником Пасхи. В таком торжественном настроении я лёг спать. Но как лёг, успокоился. Я почувствовал, что мне ноги начинает пощипывать. Уснул я скоро. Ночью меня разбудила жгучая боль в ногах. Я начал стонать и ворочаться, что скоро услышала мама. Зажгла лампу и увидела, что мои ноги стали красные и распухли. Мама укладывала холодным листом ботвы с бураков, а утром попросила свежих сливок и смазывала. Школу пришлось на день оставить. К вечеру стало лучше, а на завтра повели в школу. Што это была за школа! Парт не было. Стояла длинная деревенская лавка вместо парт. Сидеть – на колодках положена доска. Было несколько что-то вроде парт, но все разнообразные. Учеников пропасть, от восемнадцати лет и до восьми. И все в первый класс. Было, правда, три или четыре во второй определённых. Они знали немного по русскому обучению их родителями.*

*Учебников почти не было. Тетради было легче достать. Тетради в Дуниловичах были, только дорого, 20 грошей штука. Учебники тоже кое-как доставали, но они были разнообразные, ибо типографии в то время были частные. И каждое такое частное издательство издавало по-своему, что очень затрудняло и учительницу, и учеников. Каждому почти надо задавать уроки по отдельности. Кроме того, школа была польская, учительница говорила только по-польски, а население – белорусы.*

Як правільна напісаў І. Сівіцкі: насельніцтва – беларусы, а школы – польскія. Гэта яшчэ адзін аргумент на карысьць таго тэзісу, што заходнебеларускія землі знаходзіліся менавіта пад акупацыяй Польшчы. Хай сабе і адносна мяккай, якая выражалася збольшага толькі ў паланізацыі насельніцтва і сыравіннай прывязцы рэгіёна да прамысловай Польшчы, але тым не менш.

*Никто раньше из старых слова польского не знал. За исключением католиков, ибо католики молились на польском языке, и ксёндз говорил по-польски. Зато я в этом деле был в полном выйгрыше. Первое, что вся моя родня и я – католики.*

*Все, стар и мал, понимали польский язык и считали себя поляками. Кроме того, дядя свою дочь учил говорить только по-польски. С ней все говорили по-польски, и мне приходилось это делать. И тут-то всё пошло мне на пользу.*

*Алфавит я знал польский, разговор знал, молитвы знал. Чтение у меня пошло как по маслу, а вот писание – вот где я горя хлебанул. Так страшно я писал, что и рассказать вам не могу. Ну, как там ни было, в школу я хожу. До весны доходил, может, даже и до половины мая, и начал я сачковать. Мама стала ходить на работу, подгонять меня некому стало. Школа тоже не обращала внимания: хочешь – ходи, хочешь – нет. Так я и бросил. Заподрадился пасти скот дяди. Мама не возражала. К этому времени и Антя закончила учёбу шитья. Но не было швейной машинки. Она тоже ходила на подёнщину. Всё было нормально. Я не без дела. И вот пришло летнее время, надо идти учиться религии, подготовляться к первой исповеди.*

*Тут-то уже стало страшно. Дело с ксендзом. Первый раз мама повела. Хотя я до этого ходил в костёл, видел издалека и ксендза, а всё-таки страшно было. Сразу нас позаписывал ксёндз. Таких оболтусов, как я, была уйма со всего прихода. Потом разбили на группы. Нашлись такие богобоязные шляхтянки, которые нас обучали. Я был в этом деле уже достаточно обучен. Просто я только повторял то, что было мне вложено в голову дедом и мамой.*

*На все вопросы я отвечал бойко. А что не знал, то зазубривал скоро. И через месяц я даже с успехом отбыл первую споведь. До религии был доведён. Пока я эту споведь отбывал, дядя боровину обгородил и я ему больше ненадобный стал. Тогда пришёл Кобылинский и договорился с мамой. И забрал к себе пасти скот.*

Атрымліваецца, гэта быў прыкладна чэрвень 1927 г.

*И с тех пор моё батрачество стало бесперебойным с 1927 г. по 1935 г. Это было уже настоящее батрачество. Надо*

*прямо сказать, что я здесь горя хлебанул. Надо было пасти 6 коров, да свиней штук 5, овечек, может, 12 шт. и кони. Когда не работают, надо было за коньми наблюдать. Пас я возле большака, напротив Русецких, только по ту сторону. Это называли попар. Эта земля готовилась под озимые и не обсевалась. Пахать – перепахивалась, а по пожням пастили скот. Травы не было, скот бегал кругом, посевы не обгорожены. Вот тут-то мне и доставалось. Разумеется, ходил босиком. Кормёжка тоже неважная. А спал в сарае, в старой соломе.*

Даволі маляўнічая карцінка, якая яскрава паказвае, як даводзілася жыць парабку ў гаспадара за польскім часам, асабліва калі гэта сірата, які яшчэ не можа адстаяць свае правы.

*Однажды мама утром пришла жать рожь по наёму, и они сказали маме, кабы она меня разбудила гнать в поле. Когда мама пришла и увидела, что я лежу в старой соломе и прикрывшись мешком, она горько заплакала, а им не посмела ничего сказать. Она всегда в таких случаях говорила: "Нехай им бог отдаст". Да вообще, стоит ли это всё рассказывать? Помню один случай. Скот я пас на лужку возле веретейской дороги. Вокруг на нивах ещё стояла рожь, только сено было убрано. Я гнал скот по проулку возле огорода, где были огурцы. Я вскочил в огород, вырвал один огурец. Дай, думаю, и второй поищу, как слышу, Кабылинская ругается. Я испугался и тягу с огорода. А когда осенью скот стал в хлев, я опять пошёл в школу. Только на этот раз в Белевичи, так как с Лапишек школу перенесли в Веретеи, а Гулидово закрепили к Белевичам.*

Атрымліваецца, што з чэрвеня Іосіф працаваў пастушком каля 5 месяцаў.

*Поехали к Кобылинскому получать мой заработок. Взяли коня у дяди. Поехали: мама, я и Шишко Фелька помогал. Хотя у нас договорённость была 7 пудов ржи, мама захотела взять три пуда ячменя и четыре ржи. Так он дал ячменя хорошего, а ржи с уха, то есть второго сорта. Едем домой, Фелька и говорит: "Вот сволочь, жита-то он дал с уха". Мама только*

*ответила: “Нехай ему бог отдаст”. Вот так и жили. И это всё было только потому, что вся религия сводила – быть смиренным, не прекословить, если на этом свете плохо, зато в загробной жизни будет хорошо. А кулаки этим и пользовались.*

*Дальше пошли год за годом моего батрачества. Менялись хозяева, менялись места моего жительства. Всюду было похоже одно на другое. Всюду были одни и те лапти, самодельная одежда и та старая, с плеча хозяина. Иногда за неимением кнута, было, догоню корову и вместо кнута нахлёстываю рукавом от хозяйского пиджака, ибо он мне был слишком долгим. Но я год от года подрастал, начал общаться с такими пастухами, как я, начал смелеть. Начал сам лапти плести, корзины плести, мётлы вязать, это всё входило в обязанность пастуха. А когда хозяйки досаждали, то и штуки им начал я строить.*

*Это было в тех же Лесунах, где раньше жили мои родители. Одна баба так нам, пастухам, надосадила. А нас было три пастуха. Всегда мы её скот плохо накармливали. А мы между собой жили дружно. Вот мы выпросили у моего хозяина пеньки и свили себе хорошие кнуты, просмолили дёгтем и пошли мыть руки в канаву. Мы были вдвоём нанятые, а третий был местный. С тем у нас дело не очень ладилось, просто мы ему не доверяли. Вот мы вдвоём сделали кнуты, вымыли руки в канаве. Идём и стегаем кнутами по траве. Дошли до огородов, где были крайние грядки бураков этой бабы, которая нам досадила. Стеганули кнутами по ботве бураков. Рубили как косой. Мы ей и срубили ботву на двух грядках и пошли как ни в чём не бывало. К вечеру пригнали скот домой. А возле тех грядок собралась толпа людей. Слышно, кричат. Нам стало неловко. Мы переглянулись, ухмыльнулись и пришли к своей хате. А людей целая толпа, и никто не может понять, что случилось с бураками, кто их съел. Следов никаких нет, ботва сорвана, но не съедена. Так и вернулись, не разобравшись, что случилось. Только мой хозяин, старик, он нас, наверное, видел там и дога-*

*дался, но никому ничего не сказал. Только когда пришёл, взял в руки мой кнут, посмотрел и сказал: "Ну и сукины вы сыны". Улыбнулся и пошёл. Мы ему только через некоторое время признались. Так шли год за годом. Менялись хозяева, менялись места моего жительства.*

Паколькі папярэдні год пазначаны як 1927, а наступны ўказаны 1929, то лагічна меркаваць, што апісаны вышэй выпадак адбыўся ў 1928 г. На жаль, не ўказана толькі, у якой вёсцы. Як мы бачым, лёс беларускага селяніна, асабліва беззямельнага парабка, у Заходняй Беларусі быў незайздросным. Так, з голаду не паміралі і голымі не хадзілі, але і сказаць, што жылі заможна, таксама не атрымліваецца. Цяпер мы зноў зьвернем наш позірк у бок БССР і паглядзім, як разьвіваліся падзеі там пад канец 1920-х гг.

Як мы ўжо вызначылі вышэй, палітыка НЭПа стымулявала разьвіцьцё сельскай гаспадаркі і шчыльна зьвязаную з ёй лёгкую прамысловасьць. У той час як для кіруючай у СССР камуністычнай партыі неабходна была менавіта цяжкая прамысловасьць. А неабходнай для продажу сыравіны, у тым ліку і сельскагаспадарчай, у савецкай дзяржавы яўна не хапала для рэалізацыі яе амбіцыйных мэтаў. Не жадаючы чакаць паступовага разьвіцьця ўсёй эканомікі ў цэлым з паступовым натуральным стварэньнем неабходнай матэрыяльнай базы для разьвіцьця цяжкай прамысловасьці, бальшавікі вырашылі паскорыць увесь гэты працэс на свой фірмовы лад. А менавіта – адабраць. Праўда, потым ужо адабранае не падзяліць, як гэта было раней, а прадаць для рэалізацыі сваіх мэтаў.

Для гэтага ў 1927-1928 гг. савецкая дзяржава па сутнасьці вярнулася да практыкі харчразьвёрсткі часоў ваеннага камунізму: зерне ў сялян сталі гвалтоўна канфіскоўваць. У першую чаргу ў тых, хто прадаваў свой хлеб не дзяржаве за капейкі, а на рынку за нармальную цану. А потым і ва ўсіх, хто не жадаў прадаваць дзяржаве свой хлеб. Такое актыўнае рабаваньне насельніцтва хутка прынесла свае вынікі: падчас хлебанарыхтовак узімку з 1927 г. на 1928 г. дзяржава сабрала хлеба з сялян у 3,5 разы больш, чым у папярэдні год. Цяпер бальшавікам ужо было што прадаваць за мяжу, каб набыць такую неабходную валюту для правядзеньня фарсіраванай індустрыялізацыі.

Чым жа абярнулася гэтае рабаваньне для тых беларусаў, якія

жылі ў БССР? У 1927 г. у лісьце ў ЦК КП(б)Б з Чабатовіцкага сельсавета Гомельскага раёна паведамлялася, што сяляне шэрагу вёсак па два тыдні не бачаць хлеба, “маюцца выпадкі сьмерці ад недаяданьня”. У лісьце з Аршанскай акругі гаварылася, што бедната ў колькасьці 35 тыс. гаспадарак засталася зусім без хлеба, людзі ядуць жмых, віку, чакаецца ў будучым вялікая сьмяротнасьць. Зразумела, што толькі двума гэтымі раёнамі штучны голад сярод сялян, выкліканы бальшавіцкім рабаваньнем хлеба, не абышоўся. Ва ўсёй гэтай гісторыі самым цынічным выглядае тлумачэньне бальшавікамі таго рабунку, які яны ўчынілі: для “задавальненьня патрэбаў насельніцтва і дзяржавы ў харчаваньні, фуражы і насеньні ў выпадку неўраджаю і іншых надзвычайных акалічнасцяў”. Цікава, патрэбы якога насельніцтва яны зьбіраліся задаволіць такім чынам? Няўжо тых беларускіх сялян, якія ў гэты самы час пухлі з голаду ў сваіх вёсках?

Праўда, такое адкрытае рабаваньне было не вельмі зручным метадам здабываньня неабходнага хлеба на экспарт. Па-першае, сяляне чыста псіхалагічна ўспрымалі гэта надзвычай негатыўна, што нараджала адпаведнае стаўленьне да самой савецкай улады ўвогуле. А па-другое, імкнучыся выжыць у такіх умовах, сяляне зноў сталі хаваць свой хлеб, як гэта ўжо калісьці было. Таму, пачынаючы з таго ж самага 1927 г., савецкая ўлада пачынае пакрыху цісн уць на сялян, каб тыя ўступалі ў калгасы. Выгада ад калгасаў для дзяржавы была выдавочная: кантраляваць такую гаспадарку і забіраць у яе хлеб у неабходных колькасьцях нашмат прасьцей, чым у кожнага селяніна паасобку. Псіхалагічна ў калгасе ніхто з сялян ужо не ўспрымае калгасную маёмасьць як сваю асабістую, таму і змагацца за яе або хаваць яе дзе-небудзь не будзе. Але ўступаць у калгасы беларусы ніяк не хацелі. Нягледзячы нават на тое, што дзяржава забясьпечвала калектыўныя гаспадаркі сельскагаспадарчай тэхнікай і выдзяляла ільготныя грашовыя сродкі. Беларусы ўсё роўна трымаліся за тыя лапікі зямлі, што ў іх былі, не жадаючы аддаваць іх у нешта агульнае і нічыйнае, што кантралявалася дзяржавай, а не самім селянінам.

У выніку, нават ня гледзячы на ўсю савецкую агітацыю, да 1928 г. ад усёй пасяўной плошчы толькі каля 2% належалі калектыўным і сумесным гаспадаркам, а астатнія 98% заставаліся ў аднаасобнікаў. Псіхалагічнае нежаданьне беларускіх сялян аддаваць сваю зямлю не-

вядома каму без усякіх гарантый атрыманьня за гэта нейкага матэрыяльнага дабрабыту мела пад сабой і эканамічнае абгрунтаваньне: ужо ў дваццатыя гады спецыялісты па сельскай гаспадарцы адзначалі, што прадукцыйнасьць прыватных гаспадарак перавышае прадукцыйнасьць калектыўных. Таму такое імкненьне савецкай улады загнаць сялян у калгасы ніякім чынам нельга растлумачыць быццам бы нейкай эканамічнай мэтазгоднасьцю. На самой справе гэта была спроба савецкай дзяржавы за кошт сялян вырашыць свае ідэалагічныя задачы. Праўда, да 1929 г. гэта атрымлівалася не самым лепшым чынам.

*Было это уже в 1929 году. Я служил этот год с Эрусем, то есть с братом, у одного хозяина. Я был пастухом, а он – парабком. Хозяин был богатый, имел 60 гектаров земли. Местность та находилась возле Мосара. От Гулидова км 15. Это был так называемый в то время фольварок Скрабуны. Три двора. И все три – богатая польская шляхта. Во всех троих были пастухи, парабки и девки-служанки. Всем нам жилось несладко. Первое – что надо было называть не дядя, как это обычно в деревне, не хозяин, а надо звать пан и пани. Хотя они были очень далеки от настоящих панов. Мы это знали и посмеивались над этими панами.*

*А звать панами надо, ибо они нам так рекомендовали. А посторонние люди, которые приходили работать по наёму, те и больше нашего посмеивались над панами. Помню, был один бедный человек и пожилой, приходил в наём. Так он один раз, когда я назвал паном, сказал мне: “Какой это пан. Во раньше был пан – брюхо как барабан. Ноги как разопнёт, так хоть с четвёркой едь. А эти паны – по три в штаны. А начни пхать, так влезет пять”. Этот прослоек был самый плохой для службы. Они плохо кормили, сами кичились, работы много, и сами работали как проклятые. Разумеется, если работать разом с хозяином, то будет тяжелее. Я уже там каждый день не пастил. Было одно стадо с трёх хозяев. Так что я пас 13 дней, а 21 был дома, то есть работал вместе с Эрусем и паном.*

*Хотя мне было 12 лет, я уже плугом пахал. Да работы было вдоволь. И в этих Скрабунах мне пришлось сделать одно скверное дело.*

*Было так. Дело под осень, даже яровые были убраны. Я пас скот там, где через два дня сеяли рожь, и мне сказал мой пан, кабы я выпас траву. Граница была по реке с соседней деревней Гравляны. Речка порядочная. Короче, эта речка – та самая Оржаница, но по нижнему её течению она большая. Я пас возле самой речки, а гравлянский человек ловил рыбу тригубицей.*

Трэгубіца – гэта рыбалоўная сетка ў тры рады, калі дробнавочная сетка (часьцік) знаходзіцца паміж дзьвумя буйнавочнымі (рэжамі).

*Я рядом с ним хожу и смотрю, как он ловит рыбу. Он со мною ничего не говорит. Коровы мои ходят хорошо. Потом этот мужик подъехал к моему берегу, вышел с лодки и идёт ко мне. Я стою и жду, что он мне скажет. А он подошёл, отстегнул ремень и начал меня хлестать по голове. И говорит: "Видишь, где твои коровы?" Я сразу тягу дал. Потом смотрю – за рекой, на той стороне, мои четыре коровы ходят по их яровым посевам. Я перелез, коров перегнал, а мужик дальше ловит рыбу. Я своим чередом дальше пасу. Дело было под вечер, солнце светило, но совсем было низко. Мужик кончил свою ловлю, сеть свою разослал на пожне, а сам пошёл в деревню. Обида меня была так заела, что я плакал. Не от боли, а от обиды. Когда мужик ушёл далеко и скрылся в деревне, тогда я перелез на ту сторону реки и его сеть изорвал в клочья. Собрал свой скот и перегнал в другое поле. Таким образом, я отомстил свою обиду. Но до конца моей службы я боялся этого мужика. Он грозился, если меня попадёт, то мало не будет. К счастью, я ему нигде один не попался. Так и обошлось. Была осень, скот скоро стал, а в фольварке он никогда не бывал. Так и шли год за годом.*

Вось такі быў незайздросны лёс беларускага хлопчыка з беднай сям'і ў Заходняй Беларусі. Асабліва хочацца зьвярнуць увагу, што

яму ўжо ў 12 гадоў даводзілася працаваць за плугам на полі. Зразумець, што гэта такое, можа толькі той, хто сам калісьці гэта рабіў.

Цяпер зноў зьвернемся на ўсход, паглядзім, што адбывалася ў БССР у 1929 г. Трэба адзначыць, што, пачынаючы з гэтага года, найбольш яскрава праяўляецца той факт, што па сваёй сутнасьці БССР – гэта была звычайная марыянеткавая дзяржава, якая цалкам залежыла ад палітычнай волі той самай Расейскай імперыі. Розьніца была толькі ў зьмене сталіцы метраполіі – з Санкт-Пецярбурга ў Маскву – і зьмене ідэалагічнай дзяржаўнай афарбоўкі – з манарахічнай на камуністычную. А сама імперская сутнасьць дзяржавы засталася той жа самай. Наяўнасьць афіцыйных савецкіх рэспублік, якія з’явіліся на ўскрайках Расейскай імперыі, не павінна ўводзіць у зман: гэты фокус быў прадпрыняты бальшавікамі толькі з прыцэлам на далейшае пашырэньне сваёй імперыі, якую ўжо не выпадала б называць Расейскай. Таму дзеля задушэньня магчымага нацыянальнага супраціву ў новых каланіяльных ускрайках і было прыдумана надаваць ім зьнешнія атрыбуты быццам бы нейкай сваёй дзяржаўнасьці.

Пад канец 20-х гадоў у сталіцы цяпер ужо камуністычнай Расейскай імперыі новы імператар, які сьціпла называўся генеральным сакратаром, паступова засяродзіў у сваіх руках такую ўладу, якую можна было параўнаць хіба толькі з уладай мангольскіх ханаў, якія калісьці валодалі тэрыторыяй Расеі. Маючы такія неабмежаваныя магчымасьці, Сталін мэтанакіравана імкнуўся да выкананьня глабальнага бальшавіцкага плана па распаўсюджваньні камуністычнай улады на ўсёй планеце. Але, як мы ўжо раней убачылі, без магутнай індустрыяльнай базы ўсе гэтыя амбіцыйныя планы маглі разьбіцца нават аб нейкую Польшчу, не кажучы ўжо пра моцныя заходнія дзяржавы.

Хутка ўзьняць прамысловасьць СССР да патрэбнага ўзроўню для далейшай вайсковай экспансіі на Захад не атрымлівалася. Традыцыйныя эканамічныя метады паступовага назапашваньня ў дзяржавы матэрыяльных сродкаў давалі вынік толькі ў далёкай перспектыве. Спробы хуткага набыцьця неабходных сродкаў шляхам гвалтоўнага рабаваньня вялікай колькасьці сялян-аднаасобнікаў былі складанымі, бо патрабавалі шмат высілкаў, каб правесьці рабаваньне кожнай асобна ўзятай сялянскай гаспадаркі. А такі арыгінальны

метад хуткага і масавага абрабаваньня сялян як “калгас” не спрацоўваў проста таму, што сяляне самі па сабе ніяк не хацелі ўступаць у гэтыя калгасы, што з’яўляецца цалкам натуральнай чалавечай рэакцыяй, бо каму ж падабаецца, калі яго рабуюць.

У такіх варунках Сталін чыста па-камуністычнаму вырашыў гвалтоўным чынам паскорыць працэс найбольш хуткага і эфектыўнага рабаваньня сялян, то бок калектывізацыі. Менавіта ў 1929 г. Сталін пачаў гаварыць аб “даніне” з сялянства для правядзеньня індустрыялізацыі, разумеючы пад спосабам спагнаньня гэтай “даніны” калектывізацыю, якая б дазволіла рэзка павялічыць дзяржаўныя нарыхтоўкі зерня незалежна ад істотнага паніжэньня ўраджайнасьці і зьніжэньня агульнага валавага збору зерневых. Таму цалкам лагічна, што і буйнамаштабныя наступальныя дзеяньні савецкай дзяржавы супраць сялянства пачаліся ў 1929 г. Праходзілі яны ў некалькі этапаў і комплексна ахоплівалі ўсе сферы жыцьця селяніна. У БССР гэта адбывалася наступным чынам: улетку ЦК КП(б)Б забараніла хутарскую і дробнапасялковую форму землекарыстаньня. Іншымі словамі, у БССР спыняўся той працэс, які калісьці распачаў яшчэ Сталыпін і які атрымаў сваё далейшае разьвіцьцё ў выглядзе НЭПа. У той час як камасацыя і парцэляцыя на заходнебеларускіх землях у складзе Польшчы працягваліся далей.

12 верасьня 1929 г. урад БССР прыняў новы закон аб самаабкладаньні. Паводле папярэдняй версіі гэтага закона, заможныя сялянскія гаспадаркі, акрамя фіксаванага сельгаспадатка, павінны былі плаціць яшчэ амаль яго палову ў выглядзе так званага самаабкладаньня. Але паколькі беларускія сяляне, нават нягледзячы на такія паборы, усё роўна не ўступалі ў калгасы, то дзяржавай было вырашана прыдушыць іх падаткамі яшчэ больш. Цяпер плюс да фіксаванага сельгаспадатку і самаабкладаньня дадавалася яшчэ адно самаабкладаньне на задавальненьне мясцовых патрэб: пабудовы школ, дарог (аналаг “шарварак” у Заходняй Беларусі пры Польшчы) і інш. Гэта дадатковае самаабкладаньне таксама дасягала амаль паловы ад фіксаванага сельгаспадатку. Фактычна савецкая дзяржава ўзьняла сельгаспадатак для заможных сялян на 100%, у той час як бедныя гаспадаркі маглі быць цалкам вызваленыя ад самаабкладаньня. Асаблівая ўвага зьвярталася на так званых “кулакоў”, у ад-

носінах да якіх, акрамя ўсіх вышэйназваных, прымяняліся яшчэ і індывідуальныя падаткі. Прычым выплаціць свае падаткі яны павінны былі на працягу толькі 15 дзён, а не трох месяцаў, як астатнія сяляне. Мэта была тая ж самая: эканамічнае разарэньне найбольш заможных гаспадарак, каб прымусіць іх уступіць у калгас.

Адначасова ўвосень 1929 г. па ўсёй БССР стала праводзіцца масавая агітацыя сярод сялян, каб яны ўступалі ў калгасы. Такім чынам, як мы бачым, савецкая дзяржава падступіла да сялян адразу з усіх бакоў: стварыць новую сваю самастойную гаспадарку стала немагчымым, найбольш заможных сялян сталі душыць падаткамі і адначасова, як выратаваньне ад усіх гэтых праблем, сталі навязьліва прапаноўваць калгасы.

Сярод бальшавікоў яшчэ існавалі асобныя дзеячы, якія лічылі такі падыход да калектывізацыі не зусім правільным, але на Пленуме ЦК ВКП(б) у лістападзе 1929 г. яны былі раскрытыкаваныя як прымірэнцы і правыя ўхілісты. Тым самым Сталін, умоўна кажучы, даваў каманду “фас” усім мясцовым бальшавіцкім функцыянерам для правядзеньня хуткай і татальнай калектывізацыі, не лічачыся ні з якімі акалічнасьцямі. А 27 сьнежня 1929 г. ён у сваёй прамове “Да пытаньняў аграрнай палітыкі ў СССР” на навуковай канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў па сутнасьці абвесьціў аб новай палітыцы зьнішчэньня кулацтва як класа.

*1930 год прошёл как обычно. Служба в тех же Лесунах, без приключений. Если только можно рассказать, как я делал трубу с дерева. В эти грешные Лесуны я попал опять служить пастухом, только через год. С одной разницей только, что не было того моего друга, с которым я рубил ботву. А тот хозяйский сынок был, которого я раньше недолюбливал. Но, за неимением другого коллеги, пришлось и с этим подружиться. Хозяин у меня тот самый, условия те же. Словом, нет чего особо и воспоминать. Только один раз взбрело нам в голову сделать трубу такую, как у горных пастухов. В то время во всех старых пастухов были такие трубы. Облюбовали в лесу толстоватую сухую лозину, с которой раньше была ободрана кора на лапти. А хозяин мой только принёс новый топор с кузницы,*

*острый-острый. Вот меня этот Лявон и подговорил. Говорит: "Все на поле работают. Ты беги, возьми у Юлися топор. Мы трубу заготовим, потом отнесём. Всё в порядке будет. Он и знать не будет". Так я и сделал. Топор принёс. Коровы лежали. Мы побежали в лес. Я рубанул раз, а второй как рубанул, так от топора и остался молодик в дереве, вся средина лезвия и выломалась.*

У дадзеным выпадку І. Сівіцкі назваў маладзіком лязо сякеры, якое сваёй формай нагадвала "малады" Месяц.

*Мне и в глазах потемнело. Что делать? Выколупали мы этот кусочек лезвия. Я бегом домой. Топор на место заткнул за лавку. Выломанный кусочек положил под лавку, против топора. Никто меня не видел, всё в порядке. Договорились молчать. Спустя два-три дня, как раз я пришёл завтракать, а хозяйка мела хату и вымела метлой этот кусочек лезвия, подняла и смотрит. "Что такое это?" – спрашивает. Разумеется, мне в очах потемнело, но сижу и ем, как ни в чём не бывало. Хозяин посмотрел, взявши в руки, и пошёл к топору. Вытянул из-за лавки и дивится: "Как же это случилось? Наверное, когда за лавку закладывал, об стенку ударил и выщербил". На этом и кончилось. Я пришёл на пасту и рассказал Лявону. Мы посмеялись. Я радёхонёк – всё, мол, обошлось гладко. Вечером Лявон рассказал своему батьку. А, может, назавтра Лявонов батька рассказал моему хозяину. Довольно, что я только пришёл с пасвы домой, на меня мой хозяин так и набросился ругаться. Я начал отпираться, что я ничего не знаю. Он говорит: "Ты не бреши. Лявон всё рассказал сам". Я прилетел на пасту, начал ругать Лявона, а тот только смеётся. "А что, - говорит, - здорово попало?" "Конечно! Ругался", - я говорю. "Вот, ругался, беду нашёл. Я, - говорит,- как выщербил отцов топор, так он меня арапником как срезал – я две недели не мог пошевелиться. А ты испугался, что тебя ругал".*

Арапнік (назва, верагодна, запазычана з польскай мовы, ад ням. herab – "прэч") – доўгая паляўнічая пуга з пяньковым, валасяным або

шаўковым навоем, разьмешчаным на кароткім пугаўі.

*С тех пор я так потерял доверие к товарищам, что я их долго не заводил.*

А ў гэты час у БССР механізм паўторнага запрыгоньваньня сялян пад назвай “калектывізацыя” набіраў хуткасьць. 5 студзеня 1930 г. у Маскве ЦК УКП(б) прыняў пастанаўленьне “Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву”, паводле якога калектывізацыю трэба было скончыць да восені 1931 г. У гэтым жа месяцы першым сакратаром ЦК КП(б)Б у БССР быў прызначаны дасланы сюды з Расеі бальшавік К.В. Гей, які, як узорны каланіяльны намесьнік, стаў з энтузіязмам увасабляць у жыцьцё атрыманы загад з цэнтру імперыі. Выглядала гэта наступным чынам.

У Грэскім раёне (існаваў у той час бліз цяперашняга Слуцка), напрыклад, мясцовыя ўлады абвясьцілі эканамічны байкот жыхарам шэрагу вёсак, якія не пажадалі ўступіць у калгасы. Яны распарадзіліся поўнасьцю спыніць завоз у раён тавараў першай неабходнасьці: солі, газы, пагражалі арыштамі і высяленьнем. Пазбаўлялі сялян права голасу, раскулачвалі серадьнякоў і местачковых рамесьнікаў, гвалтоўна абагульнялі маёмасьць, праводзілі арышты сялян, якія супраціўляліся калектывізацыі, абразалі ў іх зямельныя надзелы. Магілёўскі акруговы камітэт партыі даў указаньне аб 25%-м зьніжэньні нормаў землекарыстаньня для сялян, якія ўхіліліся ад уступленьня ў калгасы. Старшыня аднаго з першых калгасаў у Клічаўскім раёне І.Ф. Ліпай у сваім дыярыўшы пісаў: “Прыязджае да нас упаўнаважаны ГПУ Аўсянкін і патрабуе склікаць сход. Добра, сабралі народ. Я – старшыня. Прадастаўляю слова Аўсянкіну. Той устае, вымае з кабуры рэвальвер, кладзе яго перад сабой на стол і пачынае сваё выступленьне такім чынам: “Усе вы тут на Польшчу глядзіце і палякаў чакаеце. Але вы хутчэй убачыце Сібір, чым палякаў…”

У гэтым эпізодзе асабліва цікавым выглядае тое, што савецкі карнік папракае беларускіх сялян тым, што яны глядзяць на палякаў. Дыму без агню не бывае. Магчыма, што сяляне БССР з нейкіх крыніц ведалі аб сапраўдным стане сялян Заходняй Беларусі, параўноўвалі гэта з тым, што адбывалася ў іх, і рабілі з гэтага адпаведныя высновы.

Прычым адной толькі канфіскацыяй зямлі працэс калектывіза-

цыі не абмежаваўся. Паводле цыркуляру Калгасцэнтра СССР ад 10 сьнежня 1929 г., трэба было яшчэ абагульніць (па сутнасьці, таксама канфіскаваць) хатнюю жывёлу, якая належала калгаснікам. Жыцьцёва неабходныя коні і каровы канфіскоўваліся на карысьць калгасаў цалкам, сьвіньні – на 80%, авечкі і козы – на 60%. Зразумела, што ніякай грашовай кампенсацыі за гэта сяляне не атрымалі (гэта ж не "буржуазная" Польшча, дзе падчас парцэляцыі ўладальнікам выдавалі грошы за тую зямлю, якую дзяржава ў іх забірала). І забраная ў калгас маёмасьць селяніна ў будучым не ўлічвалася пры разьмеркаваньні выробленай прадукцыі. Селяніна абрабавалі поўнасьцю, пазбавіўшы яго не толькі сродкаў вытворчасьці, але нават і сродкаў жыцьцезабесьпячэньня.

Разумеючы, што ўжо няма чаго губляць, сяляне пачалі актыўна забіваць сваю хатнюю жывёлу. У выніку за першыя чатыры месяцы 1930 г. колькасьць коней скарацілася на 173,5 тыс., буйной рагатай жывёлы – на 532,6 тыс., або на 25,6%. Якія проста выбітныя посьпехі савецкай калектывізацыі! Нічога не скажаш. Калі бальшавіцкія кіраўнікі зразумелі, што яны губляюць тую жывёлу, якую яны праз некаторы час павінны былі адабраць у сялян, то яны прынялі прэвентыўныя захады. Увосень 1930 г. ЦВК СНК СССР прыняў дадатковае пастанаўленьне "Аб мерах супраць драпежнага забою жывёлы". Цяпер за забойства сваёй асабістай хатняй жывёлы сяляне караліся штрафамі, пазбаўленьнем свабоды з канфіскацыяй маёмасьці і зямлі, высяленьнем з мясцовасьці іх пражываньня.

Адначасова былі распрацаваны пазаэканамічныя шляхі па ліквідацыі набольш працавітых сялян, так званых "кулакоў". 1 лютага 1930 г. гэтыя метады былі замацаваны ў пастанове ЦВК і СНК СССР "Аб мерапрыемствах па ўмацаваньні сацыялістычнага пераўладкаваньня сельскай гаспадаркі ў раёнах суцэльнай калектывізацыі і па барацьбе з кулацтвам". Сутнасьць гэтай палітыкі заключалася не толькі ў поўным пазбаўленьні кулацкіх гаспадарак эканамічных крыніц існаваньня і разьвіцьця: свабоднага карыстаньня зямлёй, прыладамі і сродкамі вытворчасьці, правам арэнды і найму працоўнай сілы. Але і ў прымяненьні надзвычайных мераў: канфіскацыі маёмасьці, прыцягненьня да суда, высяленьне сем'яў у аддаленыя раёны краіны. Адмыслова для гэтага ў Крымінальны кодэкс былі ўнесены істотныя

зьмяненьні, каб можна было лягчэй асуджаць людзей за любыя, нават надуманыя правіны.

Для таго каб адразу адвесьці незадаволенасьць ад вышэйшай улады, І.В. Сталін выкарыстаў стары правераны прыём “цар добры – баяры дрэнныя”: 2 сакавіка 1930 г. быў апублікаваны яго артыкул “Галавакружэньне ад посьпехаў”, у якім асуджаліся прымусовыя спосабы калектывізацыі. Узрадаваныя сяляне палічылі гэта як дазвол выхаду з калгасаў і сталі масава разыходзіцца, у выніку чаго калектывізацыя ў БССР з 58% упала да 11%. Але яны рана радаваліся. Часова адмовіўшыся ад адміністратыўнага ціску, бальшавікі ўзмацнілі эканамічны. 1 сакавіка 1930 г. СНК СССР сумесна з Прэзідыумам ЦВК СССР прынялі Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі, паводле якога кінуўшыя калгас сяляне маглі атрымаць надзел толькі з вольных земляў дзяржаўнага фонду. Вось такія пірагі атрымліваліся. Спачатку селяніна гвалтам заганялі ў калгас і забіралі пры гэтым тую зямлю, якую ён даглядаў з году ў год, і амаль усю выгадаваную ім жывёлу. А потым дазвалялі выйсьці з калгаса, але пры гэтым яму нічога не вярталася з таго, што было ў яго адабрана падчас уступленьня. Можна сабе толькі ўявіць, якая зямля з дзяржаўнага фонду выдзялялася гэтым сялянам, калі ўлічваць, што самыя лепшыя апрацаваныя землі ўжо назаўсёды засталіся ў калгасе. Ды нават калі такі селянін і атрымоўваў нейкі новы надзел, то чым яго было апрацоўваць, калі ўсю яго працоўную жывёлу з калгаса яму таксама не аддавалі? Плюс да таго – падаткаабкладаньне такіх аднаасобнікаў вырастала яшчэ больш. Хочаш пайсьці з калгаса – ніхто не перашкаджае. Ідзі і памры.

Адначасова з тым для калгасаў эканамічныя ўмовы адмыслова ствараліся як мага больш спрыяльныя. 2 красавіка 1930 г. Прэзідыўм ЦВК зацьвердзіў пастанову ЦВК і СНК СССР “Аб новых ільготах для калгасаў і іх членаў”. На два гады ад адзінага сельскагаспадарчага падатку вызвалялася ўся абагульненая працоўная жывёла ў калгасах, усе каровы, авечкі, сьвіньні і птушка як у калгасах, так і ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў. Падатак з агародаў для калгасьнікаў быў зьніжаны ўдвая. З сялянаў, якія ўступілі ў калгасы, здымаліся запазычаньні па землеўпарадкаваньні, ім адмянялі штрафы за парушэньне законаў аб падатках і іншых абавязкаў, якія ляжалі на

аднаасобнай гаспадарцы, прыпыняліся крымінальныя справы. З калгасьнікаў забаранялася браць прымусовыя ўклады ў крэдытныя і іншыя кааператыўныя таварыствы, у ашчадныя касы, ажыцьцяўляць збор задаткаў на трактары. Плюс да таго 23 красавіка 1930 г. Прэзідыум ЦВК СССР зацьвердзіў пастанову “Аб дадатковых ільготах калгасам”. Калгасьнікі вызваляліся на два гады ад самаабкладаньня, за пасевы сланечніку, ільну і кукурузы прызначаліся дадатковыя ільготы і крэдыты. З усяго гэтага пераліку лагічным чынам вынікае, што звычайныя аднаасобнікі былі вымушаны выконваць і плаціць усе гэтыя вышэйпералічаныя абавязкі, ад якіх вызваляліся калгасьнікі.

Калі ж самастойны селянін не вытрымліваў гэты падатковы цяжар і не спраўляўся з выплатамі сваечасова, то па зьмененаму Крымінальнаму заканадаўству ён лёгка трапляў пад савецкі суд. “Самы гуманны суд у сьвеце”, як казаў адзін вядомы кінагерой. “Гуманнасьць” гэтага суда была настолькі эфектыўнай, што ў сувязі з вялікім наплывам асуджаных 7 красавіка 1930 г. было выдадзена новае палажэньне аб лагерах для іх: з’явіўся сумнавядомы ГУЛАГ.

Пасьпяхова працягвалася ліквідацыя бальшавікамі найбольш працавітых беларускіх сялян. Напрыклад, па дадзеных Віцебскага акруговага калгассаюза, у сямі з дзесяці раёнаў акругі на 1 траўня 1930 г. раскулачана 579 гаспадарак. Канфіскавана, прададзена і перададзена калгасам рознай маёмасьці, жывёлы і інвентару на 485 371 руб., у тым ліку 792 кані і 1184 каровы. Няцяжка падлічыць, што на адну раскулачаную гаспадарку прыходзілася ў сярэднім па адным-двух конях і дзьвюх-трох каровах. А калі мы ўзгадаем, што па савецкай класіфікацыі кулацкая гаспадарка мела больш за 6 дзесяцін зямлі і параўнаем гэта з тым, што сярэднестатыстычны селянін у Заходняй Беларусі меў каля 10 дзесяцін зямлі. А двух коней і дзьвюх кароў маглі сабе дазволіць нават батракі(!) Сівіцкія (пакуль заўчасна ад хваробы не памёр сам гаспадар), то атрымліваецца, што па савецкай класіфікацыі сярэднестатыстычны селянін Заходняй Беларусі таксама з’яўляўся кулаком. Пасьля такіх няхітрых падлікаў вельмі цікава чытаць у савецкіх гісторыкаў пра тое, як у 1939 г. Чырвоная Армія гераічна вызваліла бедных сялян Заходняй Беларусі ад непамернага эканамічнага прыгнёту панскай Польшчы.

Усяго ж да траўня 1930 г. у БССР было раскулачана 15 629 гас-

падарак, большая частка з якіх была выселена ў Заходнюю Сібір.

Чаму ж сяляне так упарта не хацелі ўступаць у калгасы, для якіх дзяржава стварала такія прывабныя эканамічныя ўмовы? Адказ знаходзіцца ў той самай пастанове ЦК ВКП(б) ад 5 студзеня 1930 г. Гэта пастанова ператварала калгас у звяно агульнай камандна-адміністратыўнай сістэмы. У калгасе гаспадаром зямлі станавіўся партыйны чыноўнік, які загадваў, калі і што сеяць, калі зьбіраць ураджай, распараджаўся рэзультатамі працы калгасьнікаў. А селянін з самастойнага і адказнага за сваё жыцьцё гаспадара зямлі ператвараўся ў бяздумнага і безыніцыятыўнага выканаўцу волі сваіх начальнікаў, накшталт рабоў у старажытным Рыме. Сам жа калгас ператвараўся ў своеасаблівую сельскагаспадарчую арганізацыю, якой дзяржаўныя органы маглі даваць паўторныя планы нарыхтовак, адбіраць насеннае зерне. Па сутнасьці, калгасы ператвараліся ў контрагентаў у пазарыначным адбіраньні хлеба па цьвёрдых цэнах. Менавіта той самы ідэальны механізм па перапампоўцы сродкаў з сельскай гаспадаркі ў прамысловасьць для правядзеньня хуткай індустрыялізацыі, аб якой так марылі бальшавікі на чале з І.В. Сталіным.

*Пришёл 1931 год. Этот год для меня был сначала очень радостный. Во-первых, мне уже был четырнадцатый год жизни. Я уже обзавёлся и кой-какой одежонкой. Разумеется, этим руководила мама.*

*Я отвлёкся и забыл рассказать про своё образование. Первую зиму я проходил в Лапишки в школу. Вторую я проходил в Белевичи в школу, во второй класс. Потом зиму пропустил, когда служил в Скрабунах у панов Гинтовтов, потому что я там был как подручник и меня не отпустили домой. Потом опять был в Лисунах, где было дело с трубой. Опять вернулся осенью. Вернулся, как навалил снег, и пошёл опять в Белевичи, в третий класс. И на этом моё образование и закончилось.*

*Следует разъяснить. Я ходил три зимы, и то неполные. Начинал где-то в ноябре, а кончал где-то в конце марта или в начале апреля. Кончал тогда, когда приходил хозяин и забирал меня служить. А какие были условия! Учебников не было. Не*

*потому, что их вообще не было. Впоследствии уже учебников хватало и тетрадей. Но у нас денег не было, ведь я обычно служил по договорённости на зерно, на рожь. Да и куплять не было смысла, ибо в любое время меня мог забрать хозяин и учебники ни к чему. Да и никто в этом не был заинтересован, ни я, ни мама. Да и вообще тогда говорили: "Зачем мужику учиться? Может деньги посчитать, расписаться, и хватит". На этом и кончалось. Я подрос, пошёл подручником, а школа отошла. Хотя 31 год я и пас скот, но у хозяев был до Рождества и в школу не пошёл. 1931 год был радостным, потому что мне предстояло жить в Глубоком. Хозяева эти жили здесь, в Гулидове, на запашке, а на будущий год нашли запашку в Глубоком.*

*Им нужен был пастух, вот они меня и взяли. Взяли меня под весну. Сами уезжали на целую неделю в Глубокое. Там возили навоз в поле. А поле было на отшибе, то есть за два километра в сторону Крулевщизны. А жили в имении Глубокое, где теперь первая белорусская школа. Жили над озером в бетонном доме, или, как тогда называли, в бетоне. Жить было прелесть. Над озером высокая гора, а на самой горе дом с окнами. Вся сторона города видна через озеро. Было, сбегу вечером вниз и купаюсь. Других особых приключений не было. Всем пастухам, как известно, одна участь. Правда, было преимущество в том, что я вязал мётлы, плёл корзины. И таким путём я имел побочный заработок. Я за лето скопил 18 злотых.*

*Но надо рассказать ещё один случай, который сразу, вроде, не имеет значения. А значение его только выяснилось в 1935 году, когда я был в Дерковщине и когда я уже подружился с Марылькой. Дело простое. Скот я гонял каждый день по большаку. Два километра утром в поле, вечером домой. И вот один раз вечером я гоню скот. По большаку едет женщина на возу. Конь идёт нога за ногу. А у этой женщины в руке кнут до чего хороший. Я этот кнут – хоп с руки. Унёс и начал своих*

*коров гнать побыстрее. Женщина заругалась, но с воза не полезла. А с конём ей меня не догнать. Тем более, что ей коня нет чем гнать. Так я и убежал с кнутом.*

*Только в 35 году я был уже кавалер. Когда начал дружить с Марылькой, начал встречаться с её матерью. Она один раз смотрела, смотрела на меня и говорит: "Это ты, каб ты околел, один раз вырвал у меня из рук кнут". Я, конечно, вспомнил этот случай, но её буквально не признал. А она меня, хотя я был тогда и небольшой, и видела всего лишь мельком, узнала. Мне стало неловко, я начал отпираться. "Нет, - говорит, - это был ты, каб ты околел". Вот надо ж было такому случиться совпадению.*

Нягледзячы на тое, што за польскім часам адукацыя ахапіла ўдвая большую частку дзяцей навучальнага ўзросту ў параўнаньні з часамі Расейскай акупацыі, але, як мы бачым, у выпадку фінансавай нястачы не кожнае дзіця магло дазволіць сабе атрыманьне якаснай адукацыі. У выпадку канкрэтна з І. Сівіцкім бачна, што жыцьцёвыя абставіны прымусілі яго больш клапаціцца не столькі пра атрыманьне адукацыі, колькі пра забесьпячэньне свайго элементарнага выжываньня. Праўда, з цягам часу і сталеньнем маленькага Іосіфа бачны хоць і павольныя, але пазітыўныя тэндэнцыі ў пытаньні яго матэрыяльнага забесьпячэньня.

Цяпер жа, абапіраючыся на даклад упаўнаважанага ЦК КПБ(б), паглядзім на тое матэрыяльнае забесьпячэньне, якое атрымлівалі беларускія сяляне ў калгасах БССР у тым самым 1931 г.

1. Калгас "Колас Калініна", Лебедзь, серадняк: "Я працаваў у жывёлагадоўчым калгасе. Падаў 4 заявы аб маёй замене. Праўленьне калгаса аднеслася да іх няўважліва. Я працаваў цэлы год. Выпрацаваў 299,26 працадзён, а атрымаў за гэта бульбы 12 пудоў (1 пуд = 16 кг), ячменю – 32 кг, аўса – 15 кг. Я працаваў шчыра, без выхадных дзён, а зараз павінен паміраць з сям'ёй з голаду. Наш калгас атрымаў 600 пудоў хлеба за лён. Гэты хлеб елі калгасьнікі ў сталоўцы, якія працавалі і не працавалі, а мы, жыхары пасёлка, яго не атрымалі. Я хачу адпачыць і пайсьці ў іншы калгас. У маленькіх калгасах лепш жыць. Сьвіньні ў нашым калгасе ядуць бульбу ўдосталь, а я з дзецьмі

павінен не бачыць у вочы бульбіны. У мяне трое дзяцей, і на тое, што я атрымаў, мы пражыць не зможам. Ільну нам не далі зусім, так што давядзецца быць голымі з дзецьмі, таму што купіць у кааперацыі ў мяне няма грошай…”

2. Калгас імя Карла Маркса, аддзяленьне Рубчыкі, Бурдо, брыгадзір: “Мы ўступілі ў калгас у канцы пасяўной. Усё абагульнілі, за выключэньнем бульбы і азімага жыта. І працавалі па-ўдарнаму. У нас нормы былі высокія з тым, каб наш працадзень быў больш важкім. Я выпрацаваў каля 200 працадзён, за гэта атрымаў 5 пудоў аўса, ячменю – 1,2 пуда і 1 пуд гароху. Лён мы апрацавалі добра, але ніякай прэміі не атрымалі і ільну нам не далі… У нас дрэнна прайшла ўборка, засталося непрыбранай канюшыны 40 га, гарох абсыпаўся. У цэнтры калгаса ўсе выпрацавалі па 400-500 працадзён, а мы выпрацавалі за 7 месяцаў без выхадных дзён напалову менш працадзён, але работы зрабілі больш. Аддзяліце нас, і тады мы будзем вечнымі калгасьнікамі. Усе жыхары пасёлка былі вечнымі парабкамі ў памешчыка, мы толькі ў 1929 г. атрымалі зямлю, а калі нас арганізавалі ў калгас, мы былі вельмі задаволеныя, але зараз, прапрацаваўшы год, я бачу, што жыць у гэтым калгасе не магу…”

3. Калгас імя Леніна, Радыёнаў, серадняк: “Я хачу будаваць калгаснае жыцьцё. Усю жывёлу я абагульніў і зараз хачу жыць, але жонка не хоча. Я яе і раней гвалтоўна зацягнуў. Яна кажа: “Я на іншых працаваць не хачу”. Я выпрацаваў 200 працадзён, атрымаў 4 пуды аўса, бобу – 2 пуды, гароху – 2 пуды, жыта – 5 пудоў. Грошай – 15 кап. на працадзень. Я сам пасеяў аўса 9 пудоў, ячменю – 1,5 пуды, бобу – 2 пуды, вікі – 0,5 га, ільну – 1,5 га. Усё гэта я абагульніў і ільну зусім не атрымаў. З-за гэтага мне жыць немагчыма. Я не кулак, усяго плаціў падатку 30 руб. Нас ніхто не падгаворваў. Мы добра працавалі, але амаль нічога не атрымалі. У мяне 6 душаў сям’я, і пракарміць іх я не магу. У нас цемра, ніхто да нас не прыязджаў да таго часу, пакуль мы не падалі заявы аб выхадзе. Старшыня калгаса ў нас непісьменны, мы самі біліся, біліся, пакуль разышліся. Калгасьнікі кажуць: “У памешчыка Чэркіса мы працавалі за 30 кап. у дзень, а ў калгасе мы і гэтага не атрымалі.” З часу арганізацыі калгаса ў нас не было ніводнага сходу”.

4. Калгас імя Леніна, Карлецкі, серадняк (плаціў падатак 5 руб),

сакратар калгаса: "Прапрацавалі лета, нічога не атрымалі. Я выпрацаваў з жонкай 220 працадзён. Маю трох непрацаздольных. У мяне няма ніводнай капейкі, каб купіць пачак махоркі. Мы пасеялі лён, усё абагульнілі, нам на працадні не далі ільну. Я з сям'ёй зусім абнасіўся. Я ўраджаю атрымаў столькі, што адной курыцы не хопіць – 3 пуды аўса, гароху 2 пуды, бобу 1,5 пуды".

5. Калгас "Чырвоная Зорка", Самусёнак Мар'я: "У мяне 9 душаў сям'і. Мы выпрацавалі 223 працадні, нічога не атрымалі, я абагульніла 1 карову, і з гэтай каровы прадавала малака на 54 руб., і за ўвесь час я магу атрымаць толькі 3 руб. Мы куплялі хлеб і да калгаса, таму што ў нас зямля дрэнная. Я працавала на апрацоўцы ільну і не атрымала ні ільну, ні прэміі. Я маламагутная сераднячка, калі я выйшла з калгаса, мне налічылі 40 р. падатку, самаабкладаньня 24 руб. і 44 р. адзіначасовага збору. З абагульненьня нашага хоць маленькага пасеву засталося на насеньне, а нам не далі ніводнага кілаграма. Я зараз у калгас не пайду да таго часу, пакуль не ўбачу, што ў калгасе добра".

І такіх гісторый, напэўна, будзе столькі, колькі сялянскіх сем'яў загналі ў калгасы. Параўнаем гэтыя заробкі з тымі, якія атрымліваў маленькі Іосіф, пакуль працаваў пастушком у дзяцінстве. Ён пасьвіў жывёлу ў гаспадароў, да якіх наймаўся, 6-7 месяцаў. Гэта складае каля 200 працадзён. За гэты час ён зарабляў каля 7-8 пудоў жыта. Пры гэтым у яго не было сям'і, якую трэба было карміць, бо яго маці і браты самі недзе працавалі і забясьпечвалі сваё існаваньне. Іосіфа хай і не найлепшым чынам, але кармілі і апраналі гаспадары, у якіх ён працаваў. А з цягам часу ён атрымаў магчымасьць, акрамя свайго прамога заробку зернем, крыху зарабляць ад продажу гаспадарчых рэчаў, якія ён рабіў сваімі рукамі.

А цяпер, улічваючы ўсе гэтыя акалічнасьці, можна зноў параўнаць умовы, у якіх жыў і працаваў на самой справе бедны маленькі парабак-сірата з Заходняй Беларусі падчас яе акупацыі "панскай" Польшчай, з тымі ўмовамі, якія былі створаны для беларускіх сялян у калгасах "самай свабоднай" на сьвеце савецкай дзяржавы.

*Потом 1932 год. Я попал служить в Гиньки к Михасю. К деду и отцу этому, что теперь называют "гамзуль". Здесь тоже всего не пересказать. Служба как обычно. Только мне*

*был пятнадцатый год жизни, и я уже был подручником. Дело в деревне. Я отбывал паству 3 дня. Остальное, может, больше месяца, работал с хозяевами в поле: пахал, бороновал и косить учился. Ещё старый Ярковец приходил косить к Михасю и меня учил. Паству приходилось отбывать вместе с Соней, теперешней сватьей, ибо был пастырь старый, и шли с двух хат два пастуха. Вот мне надо было несколько дней быть и с Соней. Я с ней так дрался, страшное дело. И никак иначе не называл, как смолянка или коптилка. А через многие годы жизнь свела, что стали сватами, и теперь часто это вспоминаем и от души смеёмся.*

А ў гэты час, пакуль у Заходняй Беларусі маладога Іосіфа прывучалі да працы, у БССР сялян гэтаксама адвучалі ад сваёй зямлі і ад шчырай працы на ёй. Для загону сялян у калгасы савецкая ўлада пачала шырока выкарыстоўваць сістэму штрафаў для самых непакорных. Штрафавалі за ўсё: за невыкананьне афіцыйных нормаў самаабкладаньня, за парушэньне абавязковых пастановаў і нават за звычайныя бытавыя сялянскія вечарыны. Прычым памеры штрафаў сягалі аж да 100 руб. І гэта пры тым, што часта селянін такія грошы мог зарабіць толькі за год. А калі не здолееш заплаціць штраф, значыць пад суд як “ворага народа” з канфіскацыяй маёмасьці. Па гэтай і іншых прычынах толькі з траўня 1932 г. да лютага 1933 г. з беларускай вёскі было выключана да 30 тыс. “контррэвалюцыйных, кулацкіх, бандыцкіх палітычных элементаў” – або, іншымі словамі, самых сапраўдных гаспадароў зямлі, якія працаваць умелі і любілі.

Многія іншыя сяляне, якія бачылі той гвалт, што бальшавікі чынілі над вёскай, беглі з вёскі ў горад. Колькасьць хатняй працоўнай жывёлы пасьля яе абагульненьня істотна скарацілася. Атрымалася такая сітуацыя, што і добрых працаўнікоў на вёсцы стала менш, і сродкаў працы таксама. Тыя ж сяляне, якія заставаліся ў калгасах, у выніку адсутнасьці матэрыяльнай зацікаўленасьці ў сваёй працы пачыналі паступова ператварацца ў сапраўдных “калгасьнікаў” – пасіўных і абыякавых да ўсяго выканаўцаў чужой волі. Інструктары Прэзідыума ЦВК БССР, накіраваныя летам і ўвосень 1932 г. у розныя раёны рэспублікі, паведамлялі аб шматлікіх выпадках абыякавага

стаўленьня да працы, калгаснай маёмасьці: “паслалі жанчын сена ўбіраць, а яны цэлы дзень на полі гадалі ў цыганак, аддалі ім 4 вазы сена”, “гніе на палях бульба, а калгасьнікі не ідуць на працу”, “дохнуць сьвіньні – да гэтага таксама няма нікому справы”. У Лепельскім раёне ў калгасе “Камінтэрн” каля 300 га сенажаці засталіся нясконшанымі, кармавы фонд разбазарываўся. “Без калгасаў коней на лейцах трымалі, а цяпер за хвасты ўзьнімаем”, – нявесела жартавалі калгасьнікі.

У выніку і пасяўная, і ўборачная 1932 г. у БССР, як і ўвогуле ў СССР, фактычна прайшлі яшчэ горш, чым у 1931 г. Плюс да таго ў некаторых раёнах СССР яшчэ і адбылася засуха. Але афіцыйна, на паперах, усё выглядала цудоўна. А гэта азначала, што дзяржава будзе праводзіць такія ж самыя хлебанарыхтоўкі, як і раней. І жартаваць бальшавікі зусім не зьбіраліся. 7 жніўня 1932 г. у сталіцы савецкай імперыі была выдадзена пастанова ЦВК і СНК СССР “Аб ахове маёмасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаваньні грамадскай (сацыялістычнай) маёмасьці”. Неўзабаве гэта пастанова была разаслана ва ўсе імперскія калоніі і 13 жніўня 1932 г. ЦВК і СНК БССР прынялі дакладна такую ж пастанову. Гэта быў той самы знакаміты “закон аб пяці каласках”, калі за збор з калгаснага поля пакінутых некалькіх каласкоў можна было быць асуджаным да дзесяці гадоў зьняволеньня ці нават расстрэлу.

Адначасова ў 1932 г. быў ажыцьцёўлены пераход ад дагаворных паставак – “кантрактацыі асноўных прадуктаў паляводства” да нарыхтовак у парадку абавязковых паставак, якія мелі моц падатку. Прытым што нарыхтоўчыя цэны заставаліся нізкія. Цэны на зерне і шэраг іншых прадуктаў не пакрывалі выдаткаў на іх вытворчасьць: яны былі ў 10-12 разоў ніжэй за рынкавыя. Такім чынам бальшавікі вельмі грунтоўна падрыхтаваліся вычысьціць калгасныя і сялянскія сьвірны. І гэта ў той год, калі з-за калектывізацыі, якую яны праводзілі, сабраны ўраджай аказаўся істотна меншы, чым у папярэднія гады. Тым не менш гэта іх не спыніла.

Ужо ўвосень 1932 г. стала зразумела, што сабранага ўраджаю мала і на вёску насоўваецца голад. Але загад Масквы стаяў вышэй за чалавечыя жыцьці. Праўда, пра сябе бальшавікі ніколі не забывалі: яны былі на асаблівым харчовым забесьпячэньні. А 23 лістапада

1932 г. рашэньнем сакратарыяту ЦК КП(б)Б на такое ж самае забесьпячэньне пераводзілася і раённае кіраўніцтва. Бальшавікі разумелі, што насоўваецца цяжкі час, таму "сваіх" падтрымлівалі. Праз месяц, 23-24 сьнежня 1932 г., адбыўся сход партактыву ў Менску. Удзельнікі сходу адобрылі пастанову ЦК УКП(б), у якім гаварылася аб нездавальняючым ходзе хлебанарыхтовак. Таму перад КП(б)Б, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі ставілася "баявая задача": неадкладна пераключыць усе сілы на поўнае і своечасовае выкананьне нарыхтовак.

Вельмі пасуючая лексіка. У гэтай вайне з сялянствам бальшавікі ставілі сабе менавіта баявыя задачы. А вынікам любой баявой задачы, як вядома, заўсёды з'яўляюцца чалавечыя ахвяры.

*1933 год. Я попал служить в Хверки возле Воропаево. В эти Хверки, где наша Антя училась шить. И к этому самому портному, как тогда называли – к кравцу. Должен я заметить, что все эти годы, выше рассказанные, я своим имем мало пользовался. Моё имя, как обычно, было от хозяина взято. Скажем, был я у Юлися, значит, я был Юлисев пастух. Кто пошёл, кто-то сказал: Юлисев пастух. У Михася – Михасёв пастух. А когда был у кравца, был кравцов только. Было немного приличнее, что я был только кравцов, и не пастух, и не парабок. Кравцов и всё. Хотя этот кравец был по фамилии Лавниковский, звался Ян. Но на деревне он был только кравец. Здесь я уже скот не пас, а был полным парабком. Мне шёл 16 год жизни. А раз скот перестал пасти, значит, время подоспело переходить в парни. Я уже хоть сзади, но начал ходить за молодёжью. Правда, некоторые надо мной подтрунивали, некоторые просто сжаливались. Я одет был не хуже хозяйских сынков, даже за некоторых и лучше. Я имел приличный костюмишко, ботинки к зиме, сапоги хорошие и брюки к сапогам. Словом, одет был хорошо.*

*Молодёжь мною особенно не гнушалась, но я сам был труслив. Хотя некоторые и девчата мне нравились, разумеется, такие подлетки как и я. Но это был период перелома.*

*Самое время учиться танцевать. Но, к моему большому горю, я робел. Взять такую, как я, – она стыдится, не идёт танцевать. Правда, были девки хорошие, стопроцентовые девки и они моё горе понимали. Они сами брали меня и учили танцевать, но у меня как-то не получалось. Я терялся, стыдился и с этого ничего не выходило. А кому охота возиться с пацаном? Так в этот год у меня ничего и не вышло с танцами. Хотя местные, такие, как я, уже хорошо танцевали. Как-никак, я везде был чужой. Расскажу только один случай, где я случайно был восторжествовавши над местными своими ровесниками.*

*Дело было где-то в августе. Собрались мы идти в орехи в графский лес. Нас было штук шесть. Да пошли не просто в лес, а возле графского парка, только через реку. Это в тот лес, где меня везли ещё малым совсем в Васевичи. Где мне лес оказывался вверху, висел над водой.*

*Пришли в лес. Сосны под небо, а лещины внизу под соснами – пропасть. Сплёвшись в сплошной шатёр. Орехов уйма. Хотя дело было только с полдня, светило солнце, а в лесу стояли сумерки. Мы так и нырнули в эту гущу. Те мои друзья, все они свои и держались кучей, а я отбился в сторону немного. Они разговаривают, а я молчком рву орехи. Вдруг слышу лай собаки, я и обмяк. Лесник, думаю. Присел в кусте и слушаю. Собака бросилась туда, где была толпа, и лесники туда. Их было четверо. Дело было в воскресенье. Лесники знали, что будут ходить в орехи с деревни.*

*Орехов граф собирать не разрешал так. Надо брать асигнатку, вроде пропуск, давалась за один злотый на неделю. Потом она не имела значения по истечению срока. Итак, лесники погнались за моими партнёрами. Я остался в стороне. Те дали дёру. Я слышу, собака лает далеко. Вышел на окраину изза дерева, посмотрел – тех и следы пропали, а лесники пошли к мельнице в Воропаево. Я подумал, больше они не придут, и давай рвать орехи. А те ребята прибежали домой. Воскре-*

*сенье. Все мужчины сидят под хатами на лавках. Когда они прибежали, спрашивают: "Что, лесники погоняли?" "Да, погоняли. Но мы удрали, а кравцового словили и к графу повели". И радёхоньки, и смеются. В каждой деревне обычно был один мужик, который славился умным, ну, вроде атамана. В Хверках таким был Пивус звался. Когда они рассказали, Пивус поохал, мол, жалко хлопца, напугают, да и ремнём могут отстегать, сволочи.*

*А я после бегства моих товарищей осмотрелся и давай работать. Мой мешок незадолго был полный. Я ещё и запазуху нарвал и преспокойно подался домой. Когда я вошёл в деревню, начал приближаться к сидящим мужчинам, те смотрят: "Да вон кравцов идёт", - говорят. И друзья мои здесь тоже все стоят и смотрят. Тогда Пивус встал, вышел на середину улицы, подзывает меня ближе. Я иду да посмеиваюсь. Спрашивает: "Ты как, цел?" "Цел", – отвечаю.*

*"А это что, орехи?" "Орехи", - отвечаю. "Рассказывай, как было". Я всё подробно и рассказал. Тогда Пивус и говорит: "Вот видите, не он дурак, как вы думали, а вы дураки. Смотрите, сколько он несёт орехов, и только потому, что вы – дураки. Надо было рассыпаться по одному и тихонько рвать". Тогда я и второй раз убедился, что плохой товарищ равняется предателю, ибо они считали себя в какой-то степени выше меня.*

Як бачна, з кожным наступным годам усё больш умацоўваецца тэндэнцыя паляпшэньня матэрыяльнага статусу Іосіфа. Нягледзячы на тое, што ён з'яўляецца "поўным парабкам", як ён сам сябе вызначыў, тым не менш як мінімум адзеньне ён сабе ўжо мог дазволіць добрае: "*Я одет был не хуже хозяйских сынков, даже за некоторых и лучше. Я имел приличный костюмишко, ботинки к зиме, сапоги хорошие и брюки к сапогам. Словом, одет был хорошо*". Аб сваім харчаваньні ён мог не клапаціцца, бо гэта была задача для таго гаспадара, на якога ён працаваў. І, відаць, не такое было і дрэннае яго харчаваньне, калі яго ў гэты час больш за ўсё хвалявалі

танцы з дзеўкамі. Напэўна, каб ён быў галодны і босы, то яму было б зусім не да танцаў. А пакуль у свой вольны ад працы час малады Іосіф хадзіў у арэхі да графа Пшэзьдзецкага, у суседняй савецкай Беларусі былі зусім іншыя “танцы”.

У студзені 1933 г. адбыўся аб’яднаны Пленум ЦК і ЦКК УКП(б), на якім І.В. Сталін у сваёй прамове падкрэсьліў: “…мы, несумненна, дабіліся таго, што матэрыяльны стан працоўных і сялян паляпшаецца ў нас з году ў год. У гэтым могуць сумнявацца калі толькі заклятыя ворагі Савецкай улады…” Таму ніхто і не сумняваўся, бо ўсім хацелася жыць. А ў гэты самы час у вёсках памагатыя бальшавіцкага рэжыму актыўна “паляпшалі” матэрыяльны стан сялян, у прамым сэнсе выбіваючы ў іх апошнія запасы.

“Баявая задача”, пастаўленая ў канцы 1932 г. перад КП(б)Б, выконвалася падчас “жорсткіх класавых баёў”. Тыповы прыклад таго, як усё адбывалася, у інфармацыйным артыкуле з газеты “Звязда” ад 11 лютага 1933 г.: “Да тэрміну план не выкананы. Зьбіраецца партячэйка і сельсавет. Вырашаюць, у каго яшчэ засталіся лён, зерне, бульба. Група беднаты на чале з мясцовым начальствам ідзе канфіскоўваць лішкі”. Тыя, хто аказваў супраціў, аддаваліся пад суд. Абрабаваныя сяляне-аднаасобнікі ўступалі ў калгас у надзеі, што там не дадуць памерці з голаду.

У дапамогу гэтым мясцовым “калектарам” СНК СССР і ЦК УКП(б) прынялі пастанову “Аб абавязковай пастаўцы зерня дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі”. Праводзіць закон у жыццё павінен быў саюзны Камітэт па нарыхтоўках сельгаспрадуктаў пры СНК СССР, створаны ў лютым. Для гэтага стваралася адмысловая сістэма ўпаўнаважаных усіх узроўняў, якая падпарадкоўвалася толькі камітэту. Так мовіць, “калектары” дзяржаўнага ўзроўню, рашэньні якіх па выбіваньні прадуктаў у сялян былі абавязковымі для ўсіх органаў улады на месцах.

Асаблівая ўвага цяпер ськіроўвалася на сялян-аднаасобнікаў. Каб было лягчэй выбіць з іх зерне і прымусіць уступіць у калгас, 23 лютага 1933 г. СНК БССР прыняў пастанову “Аб дадатковым выяўленьні кулацкіх гаспадарак”. Вядома, ніякіх кулакоў ужо даўно не засталося, але на вайне ўсе сродкі добрыя. Пастанова абавязвала НК фінансаў і яго органы на месцах, раённыя выканкамы і сельскія Са-

веты праверыць усе гаспадаркі, якія з 1928 г. былі падвергнуты індывідуальнаму абкладаньню. Нават калі ў 1931-1932 гг. яны “не мелі надворных непрацоўных эксплуататарскіх прыкмет”, усё роўна зноў падвяргаліся абкладаньню. Моцныя гаспадаркі былі ўжо эканамічна задушаны ў мінулыя гады. Цяпер наступіла чарга эканамічнага задушэньня “сераднякоў”.

Селяніна, як дзікага зьвера на паляваньні, абклалі з усіх бакоў. Прыхаваў дома зерне, каб было чым дзяцей карміць, – пад суд. Супраціўляўся падчас канфіскацыі – пад суд. Не пасьпеў своечасова аплаціць усе падаткі, самаабкладаньні і штрафы – пад суд. На калгасным полі сабраў жменьку ўтаптанага ў бруд зерня, каб не памерці з голаду – пад суд. У першым квартале 1933 г. за парушэньне аднаго толькі сумнавядомага закона “аб пяці каласках” у БССР, па няпоўных дадзеных, было асуджана да дзесяці гадоў пазбаўленьня волі і да расстрэлу 5526 чалавек, большасьць з якіх былі асуджаны як “ворагі народа”. Беларускія турмы былі перапоўнены такога роду “злачынцамі” з рознымі тэрмінамі пакараньня. Па стане на 4 лютага 1933 г., у турэмным заключэньні ў БССР знаходзілася 21 440 чалавек, у той час як усе камеры былі разьлічаны толькі на 6293 чалавек.

Такія мэтанакіраваныя рабаўніцтва і зьдзекі з сялянства на фоне мінулагодняга неўраджаю заканамерна прывялі да мацнейшага голаду ў СССР у 1933 г. Колькасьць ахвяр таго голаду да гэтага часу дакладна не ўстаноўлена. Па апошніх падліках, лічба вагаецца недзе каля 7 мільёнаў чалавек. Большая частка загінуўшых, каля 4 млн., прыйшлася на Украіну, дзе гэты справакаваны бальшавікамі Галадамор набыў рысы сапраўднага генацыду. Савецкай Беларусі ў гэтым плане, калі так можна сказаць, крыху больш “пашчасьціла”, бо наша краіна не належала да ліку хлебаробчых, у выніку чаго спусташальныя бальшавіцкія хлебанарыхтоўкі не ўдарылі па нас так катастрафічна, як па Украіне. Тым не менш у 1933 г. беларускія сяляне таксама добра “наеліся” сталінскага матэрыяльнага “дабрабыту”.

У 1933 г. толькі ў Ельскім раёне голадам былі ахоплены тры сельскія Саветы, у Нараўлянскім – шэсьць, усяго каля 500 двароў. Тут адзначана 130 сьмяротных выпадкаў ад зьнясіленьня. Да 230 чалавек апухлі ад голаду. Кіраўнікі Хойніцкага раёна ў дакладной запісцы, накіраванай у ЦК КП(б)Б і Наркамзаб БССР, пісалі:

“Становішча з забесьпячэньнем хлебам у раёне з’яўляецца катастрафічным”. Не было хлеба ў асноўным на паўднёва-ўсходніх тэрыторыях рэспублікі. Летам 1933 г. кіраўнікі Гомельскага раёна паведамлялі ў ЦК КП(б)Б: “У цяперашні час па калгасах раёна невераgодна цяжкае становішча з харчаваньнем. З 93 калгасаў у 45 калгасах адсутнічаюць якія-небудзь прадукты харчаваньня як у калгасах, так і ў саміх калгасьнікаў… Ад голаду ўжо памерлі ў калгасе “Вольная праца” – 4 чалавекі, “Воля” – 3, “Пяскі” – 2 і вялікая колькасьць апухае”.

Калі ж беларускаму селяніну ў 1933 г. удавалася пазьбегнуць сьмерці ад голаду, справакаванага бальшавікамі, то не заўсёды ўдавалася застацца жыць у сваёй хаце. Як паведамлялася ў дакладной запісцы Жлобінскага РК КП(б)Б ад 15 ліпеня 1933 г.: “…у нашым раёне налічваецца 216 гаспадарак з 885 едакамі, якія падвергліся адміністрацыйна-судоваму перасьледу з боку органаў ГПУ і суда з канфіскацыяй маёмасьці. Гэтыя сем’і ў сваёй большасьці засталіся ў раёне і жывуць у галечы, бадзяючыся па чужых кутках, выклікаючы незадаволенасьць, і тым самым ствараюць непажаданы настрой сярод працоўных аднаасобнікаў супраць Савецкай улады.”

Колькі ж тысяч такіх жабракоў бадзялася па ўсёй БССР? Колькі ўсяго беларускіх сялян загінула ад голаду? Колькі загінула ў турмах і ў сталінскім ГУЛАГу?

А ў гэты самы час бедны парабак Сівіцкі Іосіф па нядзельных днях вучыўся танчыць з дзеўкамі ў сваім касьцюмчыку або хадзіў у панскія арэхі. Праўда, польскія прыгнятальнікі, у адрозьненьне ад “чырвоных вызваліцеляў”, за пяць арэшкаў чамусьці не расстрэльвалі.

*Наступил 1934 год. Я был как-то в Дуниловичах на базаре. Подошёл к моей дядине, где она продавала поливу. Она и говорит мне, что её одна знакомая женщина с Дунилович спрашивала, где бы им взять парабочка. Дядина ей пообещала привести меня. И как только на базаре я подошёл, сказала мне не идти домой, заночевать у них, ибо в это время дядя Эрусь жил уже в Дуниловичах. Купил дом и делал поливу в Дуниловичах.*

*Итак, дядина мне эту хозяйку так расхваливала. Семья небольшая, две пожилые и девушка. Короче, это была вдова-мать, дочка и старая дева – сестра мужа. Я остался вечером. Меня и повела дядина, как лошадь на базар. Так их она расхваливала: люди хорошие и всё такое. Я и пошёл с дядиной. Идти мне самому наниматься в парабочки – это было хуже смерти. Первый раз я в своей жизни шёл сам наниматься. Да ещё зная, что там есть девушка. Но жить надо и на всё надо соглашаться. Мы скоро и договорились – 55 злотых от марта до Рождества. Мне шёл семнадцатый год жизни. Я уже должен 6 гектаров земли обрабатывать один самостоятельно. Разумеется, под руководством хозяйки. Главное дело – я опять попадаю в местечко, что меня очень прельщало.*

*Только вот эта молодая хозяйка – девушка, для меня было что-то мучительное. Девушка была в полном расцвете, ей было лет 18-19. Очень красивая и очень вежливая. Правда, она была портниха. Мне с нею работать приходилось мало, так как её мать и тётка были ещё крепки. Но во мне был период, когда в юноше начинают чувства брать своё. Я был почти влюблён, и это меня очень смущало. Я просто при каждой встрече терялся. Старые хозяйки на это не обращали внимания. Они были уверены, что я ещё ребёнок. По сути дела, так оно и было. Притом они имели свой расчёт. Они полнолетнего парабка не хотели брать с осторожности, а вдруг кабы ихнея Анюта не влюбилась. Но Анюта – девка опытная. Она имела кавалера, с которым дружила и впоследствии вышла замуж за него. Он был от Дунилович километров за пять и бывал с ней только по воскресеньям. Я это знал, и всё-таки как-то я перед нею трепетал. Она это скоро заметила, и ей, по-видимому, это доставляло удовольствие. Потому что всякий раз, когда мы садились за стол кушать, она всякий раз что-нибудь придумает: то заговорит, то ей хлеба отрежь, подай, то ложку подай. А то, как нет близко старых, то и пощекочет. Тогда я*

*делался как кумач, а она только посмеивалась. А когда пришла сена уборка, словом, в поле уборка, ходили сено сгребать, она всегда норовила быть поближе ко мне. Насгребает и зовёт: ходи, забери. Везём домой, старые идут за возом, а я с нею еду на возу. Тогда уже совсем таял, а она всё подшучивает.*

*Вот так я и прожил этот год. Компаний ни с кем не водил. Поблизости таких подростков не было. Старшие меня в резон не принимали. Словом, они – мещане, а я – парабок, совсем не чета. Так я один почти и прокорпел этот год. Я добыл до Рождества и пошёл домой. Я готов был остаться и на второй год, но вскоре после Рождества Анюта вышла замуж, вернее, взяла себе домой этого Сороку с Петрович. Кончился 1934 год.*

Акрамя першай юнацкай закаханасьці Іосіфа, апісаньне яго жыцьця ў 1934 г. цікава яшчэ і дакладнай сумай аплаты яго працы на сваіх новых гаспадароў. За 10 месяцаў з сакавіка да сьнежня ён атрымаў 55 злотых, гэта значыць, што ў месяц ён атрымліваў 5,5 злотых. Заробак даволі сьціплы. Але з улікам таго, што жыў ён у гаспадароў і харчаваўся ў іх, то за жыльлё і ежу яму плаціць не трэба было. Таму гэты свой, хай і сьціплы, заробак ён мог выдаткоўваць на набыцьцё розных прамысловых рэчаў, якія былі яму патрэбны. У тым ліку і на адзеньне. Так што, як бачна, нават бедны парабак у Заходняй Беларусі пры Польшчы быў і пакормлены, і апрануты. Праўда, гэта максімум, што парабак з такім заробкам мог дасягнуць. Набыць за такія грошы сваё асабістае жыльлё і зямлю для самазабесьпячэньня было нерэальна. І хоць польская ўлада зрабіла істотныя зрухі для фарміраваньня так званага сярэдняга класа сярод сялянства Заходняй Беларусі, але пытаньне істотнай долі маламаёмасных і беззямельных сялян было яшчэ далёкім ад вырашэньня.

І пакуль у польскай дзяржаве павольна ствараўся заможны беларускі селянін, у БССР ён актыўна зьнішчаўся. На канец 1934 г. узровень калектывізацыі ў БССР дасягнуў 72,6% ад усіх сялянскіх гаспадарак. Было абагульнена 80% пасяўных плошчаў. Гэта былі менавіта тыя паказчыкі, якія былі вызначаны пастановай ЦК УКП(б) ад 2 жніўня 1931 г. для правядзеньня калектывізацыі. Такім чынам,

можна было лічыць, што калектывізацыя ў БССР афіцыйна была завершана. Але не завяршыліся рэпрэсіі супраць сялянства. Карны савецкі махавік ужо набраў хуткасьць: па законе “аб пяці каласках” за 1933-1934 гг. было асуджана 10 206 чалавек, за нядбайнасьць пры выкананьні службовых абавязкаў за тыя ж два гады было асуджана 50 380 беларускіх сялян і г.д.

За час калектывізацыі было раскулачана каля 95 тыс. сялянскіх гаспадарак БССР, пераважна заможных. Па статыстыцы, апублікаванай у 1927 г., беларускія заможныя сем’і ў сярэднім мелі па восем і больш чалавек. Такім чынам, можна толькі меркаваць, колькі соцень тысяч беларускіх сялян, пазбаўленых бальшавікамі свайго жыльля і маёмасьці, былі гвалтоўнаператвораны ў жабракоў. Каб пазьбегнуць такой долі, шмат беларускіх сялян самастойна з’язджалі з Беларусі, пераважна ў Сібір. Але ў адрозьненьне ад тых беларусаў, якія з’язджалі ў Сібір у 20-я гады ў пошуках зямлі і лепшай долі, гэтыя эмігранты 30-х гг. уцякалі са сваёй радзімы, каб выратавацца ад тых шалёных эксперыментаў, якія над імі праводзіла савецкая дзяржава.

На жаль, далёка не ўсім гэта ўдавалася. Вялікая колькасьць раскулачаных і асуджаных трапляла ў зьнішчальную сістэму сталінскіх лагераў, дзе яны актыўна выкарыстоўваліся ў якасьці таннай рабскай сілы. Аб гэтым сьведчаць аб’ёмы экспарту дзелавой драўніны за мяжу: калі ў 1928 г. ён складаў 1 млн. кубаметраў, то ў першай палове 1930-х гг. дасягнуў 6 млн. кубаметраў. У СССР нарэшце “паплыла” такая жыцьцёва неабходная валюта для рэалізацыі тых вар’яцкіх ідэй бальшавікоў аб фарсіраванай індустрыялізацыі, аб якой яны так марылі яшчэ з 20-х гадоў.

*Так пришёл и 1935 год. Этот год оказался в моей жизни роковым годом, на всю мою жизнь. В этом году я испытал всё, и радости, и горе. А было вот как. Где-то в половине марта пришёл к нам сосед Манчинский. Он был человек пожилой, не очень разговорчив. Пришёл и говорит: “Моему шурину в Дерковщине надо парабок. Он человек неплохой. Парабков до этого он не брал. А в этом году будет переделывать хату и хочет взять парабка. Делать по постройке он сам может, только хочет взять себе помощника. Я думаю, что у него не будет*

*плохо. Он сам при гультаю, земли немного. Так что, если хочешь, то я завтра запрягу лошадь и завезу тебя. А если не понравишь, то приедем вместе домой. Подумай, если надумаешь, приходи к полдню".*

*На этом и порешили. Он ушёл. Мы начали с мамой и Антей обсуждать этот вопрос. Маме было важно то, что хозяин – католик и в Дерковщине есть костёл. От Гулидова недалеко. Словом, меня подзадорили, что служить всё равно надо, а тут место совсем подходящее. Меня настолько взял азарт на эту грешную Дерковщину, что я назавтра с самого утра выскоблился, как медный пятак, и часов в десять отправился к Манчинскому. Надо заметить, что я в эту зиму порядком прибарахлился. Сапоги хорошие, хромовые, у меня были, к ним и брюки, и пиджак, было всё хорошее. Эту зиму я купил хорошую куртку суконную, такого покроя, как военный бушлат, воротник меховой и под ремень. Ремень был тоже суконный и затягивался, как в бушлате. Я суконный ремень заменил кожаным, что придавало больше изящности, от чего я впоследствии и получил деревенскую кличку. Но об этом позже.*

*Кроме того, я купил хороший костюм. Вернее, сшил. Костюм был чёрный, с хорошего материала и очень удачно сшитый, по последней моде того время. Признаться, я после за все свои молодые года ни одного костюма так не любил. Может, потому, что он у меня был первый в моей жизни. И я первый год начал считать себя кавалером. Мне с девятого марта пошёл восемнадцатый год жизни.*

*Итак, я пришёл к Манчинскому. Он начал собираться. Сели обедать, пригласили и меня к столу. Я, конечно, в их доме был свой человек. У них была дочь Алина, бралась уже под девочку. Словом, у них собиралась молодёжь. Пообедав, Манчинский запряг лошадь, и мы поехали. Погода была прекрасная, светило солнце. Снег был шершавый, дорога расползалась, но ещё была хорошая санная дорога. Ещё когда мы садились в*

*возок, так Манчинская говорит мне: "Ты, Юзеф, смело оставайся. Скуллё тебя не возьмёт. Наш Юзеф хороший". Это был её родной брат. Звался так же, как и я – Иосиф. Но по-польски звали Юзеф. Когда мы начали подъезжать к Дерковщине, мне как-то всё там вокруг понравилось. Просто стало как-то легко на душе. Ибо обычно в таких случаях мне было очень скучно – идёшь в чужую семью. Кто знает, что меня там ожидает, какие люди? Всегда было тревожно. А то стало, наоборот, просто радостно, весело. Въехали в деревню. Деревня как деревня. Только та разница, что посредине деревни костёл большой, каменный. Да улица вымощена булыжником, который был уже почти голый, и мы ехали стороной, выбирая снег.*

*Приехали. Дом старый, хозяева дома молодые, обоим под тридцать лет. Разумеется, они, как родственники, расцеловались, а я стою в стороне. Хозяйка сразу приглашает нас раздеваться, обоих с Манчинским. Хозяин был не очень разговорчив, хозяйка очень милая и разговорчивая. Они начали между собой разговаривать о разных своих делах. Хозяйка начала суетиться около плиты. Вернее, плиты не было, а на припечке начала ставить два кирпича и грохотать сковородой. И говорит: "Ну, ты, Кариба, иди к Магереку". Я всё это сижу да слушаю. Когда хозяин ушёл, она начала заводить разговор со мною. Начала объяснять, что Карибы – это их деревенская кличка. А фамилия их – Меховичи. "Магерек, это, - говорит, - у нас поляк держит свой магазин". Словом, я начал понимать, что она знает, зачем я к ним привезён. Хотя, ещё на эту тему никто и словом не обмолвился. Вскоре пришёл Кариба, принёс бутылку водки. Сели за стол. Когда обошли по стопочке, а я водки почти никогда не пил, так я и первую стопочку почувствовал. Но, разумеется, не развезло. Только тогда Манчинский начал: "Ну, как, вам подойдёт такой парнишка?" Пока Кариба собрался что ответить, так хозяйка первой говорит: "Ещё бы не подошёл. Я только молодых и люблю". Кариба немного по-*

*улыбался: "Да мы с ним и чёрту голову свернём. Только как на цену, ци сойдёмся?" Говорит: "Хозяйство у меня небольшое, работы не особо. Ну, при постройке тоже будешь помогать. Я, - говорит, - болтать не люблю. 60 злотых дам до Рождества". Я попробовал упираться 70, потом 65, да и сдался на 60-т.*

*На этом и ограничились. Манчинский уехал домой, я остался. Дело было к вечеру. Пошли мы с ним кормить скот. Лошадь была одна, но очень хорошая – молодая, сытая. Четыре коровы. Он мне рассказал, как и чем кормить. Всё хозяйство показал. Вечером собрались ужинать. Я всё время думал, как мне их звать. Панами – не подходят на панов. Дядей и тётей – замолодые. Вечером хозяйка спрашивает: "Как тебя звать?" Я говорю: "Юзэф". "Вот и хорошо, - говорит, - теперь у меня будут два Юзэфа, стары и молоды". Тогда я спрашиваю: "А мне как вас звать?" Тогда хозяин говорит: "Бадай ты пропал! Ещё спрашивает. Зови Юзэф и Антя". Так мы на этом и порешили. Люди они оказались очень хорошие. Это был последний год моего батрачества. А хозяева – первые и последние такие хорошие.*

*Потом немного посидели после ужина. Он говорит: "Пойдём на село, чего сидеть дома". И Антя подхватила: "Веди его, знакомь с молодёжью. Там, у великого Ватюка, всех сразу увидишь". И действительно, в каждой деревне раньше было заведено, что где-то у кого собирались. Находился такой хозяин дома, который любил, когда у него собирались. Таким был в Дерковщине Ватюк Борейко. Звали его только Ватюк великий, ибо он был ростом не меньше двух метров. Такой же и сын его был, звали великий Костусь. К этому была и другая причина. Было ещё Борейко, и также звался Вацлав, но только тот был небольшого роста, и звали его малы Ватючок. Также и сын был, тоже звался Константин, того звали малы Костусь. Вот от чего в деревне возникали клички. Словом, в Дерковщине*

*было, как и во всех деревнях – почти каждый двор или хозяин имел свою кличку. Был цыган по кличке "шелуха", "бобры" и много других. Вот когда я первый раз пришёл с Карибом к великому Ватюку, все узнали, что я Кариба парабок, то от Ватюка я уже вышел тоже с кличкой. Только разница в том, что если я раньше носил кличку от своего хозяина, скажем, от кравца я был "кравцов", то на этот раз я получил кличку от своей собственной куртки.*

*Куртка моя была довольно приличная, но главное, бросалось в глаза то, что в ней был затянут ремень кожаный. А перед этим в Дерковщину приезжал судебный исполнитель, взыскивал с кого-то недоимку за податки. Он был в такой куртке с кожанным ремнём. А по-польски исполнитель назывался экзекутор, от слова "экзекуция". По-польски "исполнение" – это выражалось "экзекуция". Вот моя куртка и ремень и были причиной моей клички. С этого первого вечера я уже в Дерковщине был не кто иной, как "агзякутор". Правда, в глаза меня называли по имени, но за глаза только по кличке. Так началась моя жизнь в Дерковщине. В первый вечер я там ничего не разобрался. Правда, я хотя и свежачок, но весь вечер проболтал с девчатами. Словом, не терялся. Мне такое не в новинку. Я держал хвост трубой, что и было причиной обратить на себя внимание. А как обратили внимание, так сразу и кличку придумали.*

*Следующий вечер я уже сам знал дорогу. Так я и влился в это общество. Девчат было порядочно. Я особого внимания ни на кого не обращал, болтал, с кем попало. Начал даже и домой провожать. Была среди них и "фигура" по кличке, я и "фигуру" провожал. Была и паршивенькая "бобриха", я и эту провожал. Началась распутица, канава разлилась. Я эту "бобриху" взял переносить да и всунулся в воду по колени. Всё это было забавно и весело. Так прошло, наверное, больше недели. Я посещаю дом великого Ватюка. И вот один вечер, как обычно, я*

*прихожу на посиделки к Ватюку. Смотрю*

І на гэтым слове першы сшытак успамінаў Іосіфа Сівіцкага заканчваецца. Заўважна, што з узростам Іосіф усё больш упэўнена адчувае сябе ў жыцьці. Ужо ведае сабе кошт, вучыцца гандлявацца за сваю працоўную сілу. Вялікую ўвагу надае апісаньню свайго адзеньня. Як мы бачым, яно ў яго зусім нядрэннае. Пры тым, што гэта ўсяго толькі звычайны парабак, у якога няма сваёй зямлі. Тут вельмі дарэчы зноў узгадаць тыя лісты калгасьнікаў, якія мы тут ужо цытавалі крыху раней: “Ільну нам не далі зусім, так што давядзецца быць голымі з дзецьмі, таму што купіць у кааперацыі ў мяне няма грошай…”, “Мы пасеялі лён, усё абагульнілі, нам на працадні не далі ільну. Я з сям’ёй зусім абнасіўся”.

Вось неяк так яно атрымліваецца. Звычайны беззямельны парабак у Заходняй Беларусі мог дазволіць сабе апранацца лепш, чым “шчасьлівыя” і “заможныя” калгасьнікі ў “квітнеючай” БССР. Цалкам лагічна меркаваць, што і харчаваўся Іосіф таксама не горш за астатніх жыхароў Заходняй Беларусі, бо калі ў цябе страўнік пусты, то цяжка скіраваць свае думкі ў бок адзеньня. У БССР на гэты час калектывізацыя ў цэлым ужо фактычна перайшла ў стадыю завяршэньня. Асноўны эканамічна моцны і ідэалагічна непакорлівы сялянскі элемент быў эканамічна або фізічна зьнішчаны. Астатняя большая частка сялянства была прымусам загнана ў калгасы. Тым рэшткам аднаасобнікаў, якія засталіся ў меншасьці, не заставалася іншага выбару, як рана ці позна таксама трапіць у калгас, страціўшы пры гэтым сваю зямлю. Лагічным завяршэньнем гэтага працэсу стала прымацаваньне калгасьнікаў да іх месца жыхарства шляхам пазбаўленьня іх пашпартаў у 1937. Нават падчас прыгону сяляне, хоць не мелі асабістай свабоды, маглі хаця б апрацоўваць сваімі прыладамі працы нейкі кавалак зямлі, які быў замацаваны за імі. У гэтым жа наваствораным савецкім прыгоне сяляне былі пазбаўлены і зямлі, і прылад працы. Ад іх патрабавалася толькі працоўная сіла і пакорлівасьць, як ад рабоў у старажытным Рыме.

На гэтай даце, 1935 г., калі скончыўся і першы дзёньнік Іосіфа Сівіцкага з Заходняй Беларусі, і калектывізацыя ў БССР, мы спынімся. Якія ж высновы мы можам зрабіць з таго, аб чым тут даведаліся? Як мы ўжо раней заўважалі, тып кіраваньня беларускай зямлёй

на захадзе і ўсходзе нашай краіны ў абодвух выпадках можна аднолькава назваць як імперыялістычна-каланіяльны. Але пры гэтым у кожным з іх меліся і нейкія свае асаблівасці.

У выпадку з Польшчай беларускія землі былі ператвораны ў звычайную калонію класічнага капіталістычнага ўзору XIX стагоддзя. Польская метраполія выкарыстоўвала каланіяльную сыравіну для разьвіцьця сваёй нацыянальнай прамысловасьці з тым, каб потым у тую ж самую калонію прадаваць свае прамысловыя тавары. Нічога новага. Тое ж самае, што са сваімі калоніямі калісьці рабілі і Англія, і Францыя, і г.д. Розьніца была хіба толькі ў тым, што насельніцтва беларускай калоніі Польшчы этнічна, моўна і культурна мела некаторае падабенства з польскай. Таму польскай дзяржавай было вырашана паланізаваць мясцовае насельніцтва, каб у будучым пазьбегнуць магчымага беларускага руху за нацыянальнае вызваленьне. Гэта рабілася праз розныя дзяржаўныя ўстановы і асабліва праз адукацыю.

У матэрыяльным плане беларускае насельніцтва было пастаўлена на другую прыступку пасьля карэннага насельніцтва польскай метраполіі. Вядома, нельга казаць, што беларусы жылі ў галечы і галадзе. Як мы бачым з успамінаў Іосіфа Сівіцкага, нават бедны беларускі парабак мог дазволіць сабе добрае адзеньне, адпаведна і негалоднае існаваньне. Але, як мы бачым з яго дзіцячых успамінаў, такое было не заўсёды. Гэта азначае, што ў грамадстве Заходняй Беларусі існавала пэўная матэрыяльная дыферэнцыяцыя. Праўда, трэба аддаць належнае польскай дзяржаве, у выніку зямельнай палітыкі гэта дыферэнцыяцыя была даволі моцна нівеліявана. І што галоўнае – польскай дзяржавай была створана такая грамадская сістэма, пры якой грамадзяне, дзякуючы сваёй працы, з цягам часу маглі разьлічваць на паступовае асабістае ўзбагачэньне. Што мы і бачым на канкрэтным прыкладзе Іосіфа Сівіцкага. І гэта пры тым, што на момант напісаньня свайго дзёньніка ён прытрымліваўся левых поглядаў.

Такім чынам, рэжым польскай акупацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі можна аднесьці да даволі мяккага варыянту, калі беларуская зямля, безумоўна, выкарыстоўвалася на карысьць польскай дзяржавы, але пры гэтым мясцоваму насельніцтву давалася магчымасьць не проста жыць, але нават і матэрыяльна паляпшаць свой стан. У

культурным плане праводзілася паступовая і поўная паланізацыя беларусаў, што таксама сьведчыць аб польскай акупацыі і каланізацыі нашай зямлі.

Савецкі ж узор акупацыі Беларусі моцна адрозьніваецца ад класічнай імперыялістычнай каланіяльнай палітыкі капіталістычнага кшталту. Калі ў Заходняй Беларусі кіравала польская нацыянальная ідэя і ўлада грошай, то ў БССР кіравала камуністычная ідэя расейскага ўзору і ўлада партыйнай бюракратыі. Сярэдзіна 1920-х гадоў у БССР выглядала адносна нядрэнна. Сялянам раздалі зямлю і паменшылі іх матэрыяльную дыферэнцыяцыю яшчэ больш, чым у Польшчы. А ў школах і дзяржаўных установах беларусам дазволілі нарэшце карыстацца беларускай мовай. І калі ў пытаньні з зямлёй яшчэ можна паспрачацца, дзе яно было вырашана лепш, у БССР ці ў Заходняй Беларусі, то ў плане культуры перавага БССР была поўнай.

Але ўжо ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. палітыка Масквы кардынальным чынам зьмянілася ў адносінах да нацыянальных ускраін сваёй імперыі. У выніку правядзеньня брутальнай калектывізацыі зямля, якую зусім нядаўна далі сялянам, зноў была адабрана. Толькі на гэты раз ужо ва ўсіх сялян, без выключэньняў. А ўсе, хто быў супраць гэтага рабаўніцтва, падвяргаліся рэпрэсіям, якія часта заканчваліся масавай сьмерцю незадаволеных. Не лепш выглядалі справы і ў культурнай сферы. На зьмену кароткачасовай беларусізацыі прыйшла хоць і схаваная, але гвалтоўная русіфікацыя: назва нашай рэспублікі захавала назву “беларуская”, але пры гэтым менавіта беларуская інтэлектуальная эліта метадычна зьнішчалася савецкай уладай, а яе месца паступова запаўнялася расейскай камуністычнай элітай, на якую было вымушана раўняцца ўсё беларускае грамадства таго часу.

Праводзіць такую жорсткую эканамічную і культурную палітыку можа толькі акупацыйная ўлада ў дачыненьні да сваіх захопленых калоній. Таму той рэжым, які быў усталяваны на ўсходніх беларусіх землях, таксама з поўным правам можна называць акупацыйна-каланіяльным. І калі польская акупацыя Заходняй Беларусі скончылася ў 1939 г., то расейска-савецкая акупацыя спачатку ва ўсходняй, а потым і ва ўсёй Беларусі прадоўжылася аж да 1991 г. І яе наступствы мы бачым да сёньняшняга часу ў выглядзе СВК у нашых

вёсках, якія, па сутнасьці, засталіся тымі ж самымі калгасамі, і ў панаваньні гвалтоўна насаджанай нам расейскай мовы ва ўсіх сферах нашага жыцьця. Наяўнасьць існаваньня беларускай квазідзяржаўнасьці ў выглядзе БССР не павінна прыводзіць нас у зман, бо на прыкладзе хаця б толькі тых падзей, якія адбываліся ў СССР падчас калектывізацыі, ужо выразна бачна, што кіраўніцтва БССР было толькі механічным прыводным рамянём палітычнай волі Масквы. Тое ж самае адбывалася і ва ўсіх астатніх сферах жыцьця.

Такім чынам, параўнаўшы абедзьве дзяржаўныя сістэмы. якія існавалі на захадзе і ўсходзе Беларусі ў міжваенны перыяд, выразна бачна, што абедзьве часткі Беларусі знаходзіліся пад акупацыяй: больш адкрытай і мяккай у Заходняй Беларусі і больш схаванай і жорсткай у БССР. Вядома, калі параўноўваць гэтыя дзьве акупацыйныя сістэмы, то польскае панаваньне над беларускай зямлёй з’яўлялася больш гуманным, чым маскоўска-савецкае. Але ў ідэале нам трэба імкнуцца да таго, каб мы самі, самастойна маглі кіраваць сваёй зямлёй, без чыіх-небудзь загадаў з захаду або ўсходу.

Падчас працы над успамінамі І. Сівіцкага выкарыстоўваліся матэрыялы з кніг:

Памяць / Г.К. Кісялёў [і інш.]; пад аг. рэд. Г.К. Кісялёва. – Мінск, БелТА, 2001.

Врублевский, А.П., Протько, Т.С. Из истории репрессий против белорусского крестьянства 1929-1934 гг. / А.П. Врублевский, Т.С. Протько. – Минск, “Навука і тэхніка”, 1992.

## P.S.

Ужо цалкам падрыхтаваўшы матэрыял раптам у апошнім нумары газеты “Наша Ніва” натрапіў на верш яшчэ аднаго геніяльнага беларускага паэта, Алеся Дудара, якога таксама забілі бальшавікі падчас зладжанага імі масавага тэрору. Верш напісаны ў тыя самыя сумныя для Беларусі часы ў міжваенны перыяд. Як кажуць – замест тысячы слоў:

Пасеклі Край наш папалам,
Каб панскай вытаргаваць ласкі.
Вось гэта - вам, а гэта - нам,
Няма сумленьня ў душах рабскіх.

І цягнем мы на новы строй
Старую песьню і чужую:
Цыгане шумнаю талпой
Па Бесарабіі качуюць...

За ўсходнім дэспатам-царком
Мы бегаем на задніх лапах,
Нью-Ёрку грозім кулаком
І Чэмберлена лаем трапна.

Засыплем шапкамі яго,
Ура, ура - патопім ў соплях.
А нас тым часам з году ў год
Тут прадаюць ўраздроб і оптам.

Мы не шкадуем мазалёў.
Мы за чужых праклёны роім,
Але без торгу і без слоў
Мы аддаем сваіх герояў.

Не сьмеем нават гаварыць
І думаць без крамлёўскай візы,
Без нас ўсё робяць махляры
Ды міжнародныя падлізы.

Распаўся б камень ад жальбы
Калі б ён знаў, як торг над намі
Вядуць маскоўскія рабы
З велікапольскімі панамі.

О, ганьба, ганьба! Ў нашы дні
Такі разлом, туга такая!
І баюць байкі баюны
Северо-Западного края...

Плююць на сонца і на дзень.
О, дух наш вольны, дзе ты, дзе ты?
Ім мураўёўскі б гальштук ўзьдзець,
Нашчадкам мураўёўскім гэтым...

Але яшчэ глушыце кроў.
Гарыць душа і час настане,
Калі з-за поля, з-за бароў
Па-беларуску сонца гляне.

Тады мы ў шэрагах сваіх,
Быць можа, шмат каго не ўбачым.
З тугою ў сэрцы ўспомнім іх,
Але ніколі не заплачам.

А дзень чырвоны зацьвіце,
І мы гукнем яму: «Дабрыдзень».
І са шчытом ці на шчыце
Ў краіну нашу зноў мы прыйдзем.

## ЗЬМЕСТ

Успаміны Іосіфа Сівіцкага ....................................................3
P.S. .............................................................................98